КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 34 (1317) 26 жніўня 2017 г.

ГЭТА ВАМ НЕ РЫА, ГЭТА МІНСК

Праект Vulica Brasil падобны на ўварванне — колеру, творчасці, узаемадзеяння і абмену. Ці можна ўявіць сабе больш яскравую дыпламатычную місію, чым прыдумала Пасольства Бразіліі ў Беларусі? Беларуска-бразільскі фестываль урбан-арту Vulica Brazil, які ладзіцца ў чацвёрты раз у сталіцы пры падтрымцы Міністэрства культуры і Мінгарвыканкама, не збіраецца спыняцца ні па маштабах задумы і рэалізацыі, ні па глыбіні паслання. Як сказаў бы вядомы літаратурны герой, гэта — не Рыа-дэ-Жанэйра. Гэта — Мінск!

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Дантэ Араіва з Сан-Паўлу: "Важна адпускаць мінулае і адкрывацца новаму". / Фота Таццяны СВІРЭПА

Вуліца Раманаўская слабада, 5а.

У рамках сёлетняга фэсту ў Мінск прыехала шэсць бразільскіх мастакоў. Сярод беларускіх удзельнікаў — слынныя Bazinato, Міця Післяк, Марат RGB. Але сёлетні фестываль увойдзе ў гісторыю найперш праз удзел у ім сучаснага класіка-абстракцыяніста Сяргея Кірушчанкі, які разам з куды маладзейшым "стрыт-артыстам" Андрэем Буселам спрычыніцца да пераўтварэння гарадской прасторы сталіцы.

Сапраўдны плён высілкаў street-марафона будзе бачны напрыканцы фестывалю — 2 і 3 верасня, у час карнавалу, які стане кульмінацыяй дзеі. Пакуль жа аглядальнік "К" заспела працу ў працэсе — на розных яго стадыях — і пагутарыла з некаторымі ўдзельнікамі фестывалю: што значыць для кожнага з мастакоў street-art, пра што распавядаюць іх працы, ці вераць яны ў "зялёны" горад.

Дантэ Араіва: "Адпусціць мінулае"

Яго праца на вуліцы Раманаўская Слабада яшчэ не скончана, але людзі перад незвычайнай выявай ужо спыняюцца. На ёй — маладая жанчына ў белай сукенцы падразае валасы старэйшай кабеце. Вочы абедзвюх заплюшчаныя, твары — прасякнутыя спакоем. Пакуль я чакаю, калі мастака апусціць на зямлю з вялізнага пад'ёмніка, стан задуменнасці паступова ахоплівае і мяне.

— Гэта своеасаблівая канцэнтрацыя ды нават медытацыя, — распавядае Дантэ пра рытуал, што адбываецца на яго мурале. — Мне падабаюцца выразы твараў гэтых жанчын. Яны нібыта глядзяць унутр сябе, і я хачу нагадваць людзям пра тое, як важна занурацца ў свой унутраны свет і разбірацца з уласнымі прывідамі.

Мая праца выяўляе неабходнасць быць адкрытым да чагосьці новага. Ёсць мінулае, якое цягне нас назад. Яно можа прымаць розныя абліччы: пэўныя сацыяльныя стасункі, таксічнае атачэнне, нават рэлігія або заскарузлыя традыцыі… Калі яны запаўняюць нас цалкам, то месца для таго, каб убачыць новыя магчымасці, не застаецца. І цяперашняе становіцца закладнікам мінулага. Я хачу нагадаць пра тое, што важна яго адпускаць і адкрывацца новаму. Спадзяюся, маё пасланне не будзе ўспрымацца скажона ці няправільна.

Гэта першы мой мурал за восем гадоў. Папярэдні быў у Ратэрдаме. Увесь мінулы час я прысвяціў рабоце ў студыі. Не назваў бы свае творы графіці, — я працую над пано, як над вялікай жывапіснай карцінай. І большасць з іх выкананы пэндзлямі і акрылам. Вельмі рэдка выкарыстоўваю спрэй — толькі ў тым выпадку, калі мяне не задавальняе паверхня сцяны.

Заканчэнне — **на старонцы 7.**

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Пра Скарыну — ва Уроцлаве

З 19 па 25 жніўня ва Уроцлаве праходзіў Сусветны бібліятэчны і інфармацыйны кангрэс: 83-я Генеральная канферэнцыя і асамблея Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў (ІФЛА).

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Сёлетняя тэма кангрэса — "Бібліятэкі. Салідарнасць. Грамадства". Традыцыйна маштабная падзея сабрала спецыялістаў з усяго свету для абмену вопытам, ідэямі, абмеркавання новых інфармацыйных тэхналогій і дасягненняў у бібліятэчнай справе.

У рамках форуму 19 жніўня адбылося штогадовае рэгіянальнае пасяджэнне прадстаўнікоў бібліятэк краін СНД, на якім выступіла прэзідэнт ІФЛА Донна Шыдэр.

Чынны ўдзел у працы Сусветнага бібліятэчнага і інфармацыйнага кангрэса прыняла і дэлегацыя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, віцэ-прэзідэнт Бібліятэчнай Асамблеі Еўразіі Раман Матульскі падчас прывітальнай прамовы азнаёміў прысутных з мерапрыемствамі, якія пройдуць у Беларусі ў рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, і запрасіў да іх далучыцца.

Упершыню на кангрэсе ІФЛА прагучала выступленне ад Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі. Яе асноўныя напрамкі дзейнасці агучыла першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, старшыня Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі Алена Далгаполава.

Акрамя таго, 21 жніўня ў публічнай бібліятэцы Ніжняй Сілезіі імя Т. Мікульскага адбылася спецыяльная сесія, прысвечаная 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Яна стала першым мерапрыемствам у гісторыі штогадовага Сусветнага бібліятэчнага і інфармацыйнага кангрэса, ініцыяваным і арганізаваным Рэспублікай Беларусь. Гэты факт разам з уключэннем юбілею кнігадрукавання ў Каляндар памятных дат ЮНЕСКА пацвярджае значнасць спадчыны Францыска Скарыны для беларускай, усходнеславянскай і ў цэлым еўрапейскай культуры.

Падчас працы сесіі Раман Матульскі прэзентаваў міжнародны навуковы і выдавецкі праект па факсімільным узнаўленні кніжнай спадчыны Францыска Скарыны, ініцыятарамі і асноўнымі выканаўцамі якога выступілі Нацыянальная бібліятэка Беларусі і банк БелВЭБ, і распавёў пра гісторыю яго рэалізацыі. Зладжаная праца і прадуктыўнае аб'яднанне патэнцыялу абедзвюх арганізацый дазволілі дасягнуць адзінай мэты — сабраць электронныя копіі размешчаных па ўсім свеце асобнікаў выданняў Ф. Скарыны і ўзнавіць іх у выглядзе калекцыі факсімільных выданняў. У выніку на працягу пяці гадоў (2013 — 2017 гг.) быў надрукаваны 21 том унікальнага выдання.

Напрыканцы мерапрыемства адбылася ўрачыстая цырымонія дарэння шматтомнага факсімільнага выдання "Кніжная спадчына Францыска Скарыны" Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы, бібліятэкам Уроцлаўскага і Ягелонскага ўніверсітэтаў.

Таксама ўдзельнікі сесіі і калегі з Польшчы атрымалі запрашэнне на Міжнародны кангрэс "500 гадоў беларускага кнігадрукавання" і выставу "Францыск Скарына і яго эпоха", якія пройдуць у Мінску ў верасні 2017 года. К

Фрагменты свята: весялосць, творчасць, алея прадпрымальніцкай славы.

Яблык з бабулінага саду

19 жніўня на Чэрвенскім рынку прайшло святкаванне Чэрвенца (інакш кажучы, Яблычнага Спасу ці, паводле афіцыйнай рэлігійнай лексікі — Перамянення Гасподняга).

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота аўтара

Нашы прагматычныя продкі сумясцілі прынесенае з далёкага замежжа, не надта ўцямнае для мясцовых людзей свята са сваім звыклым, крэўным. Чэрвенец — гэта час, калі паспелі яблыкі, завяршылася жніво, і летняе неба, як сказаў паэт, ужо дыхае восенню. Свята ўраджаю.

У дзень свята на Чэрвенскім рынку можна было задарма пакаштаваць пірага з яблыкамі, паспяваць і патанчыць разам з вакальна-інструментальным ансамблем, набыць карысныя ў побыце альбо проста прыгожыя сувеніры, паглядзець выставу дзіцячага малюнка, складалася яна з двух сегментаў. Гэта жывапісныя работы, развешаныя па сценах гандлёвага павільёна, ператворанага дзеля такой нагоды ў экспазіцыйную прастору, а побач — малюнкі крэйдай на асфальце. Называлася мастацкая імпрэза "Вырасцім яблыневы сад!" Пірагу мне не хапіла, хоць ён і быў памерам 2,5 на 2,5 метры. Позна прыйшоў. Але музыку паслухаў, сувеніры набыў, выставу паглядзеў.

Відаць, на асфальце мог маляваць кожны ахвотны, а тое, што вісела на сцяне, прайшло сякі-такі адбор. На выставе былі прадстаўлены розныя рэгіёны Беларусі. Гэта давала магчымасць пераканацца, што фактычна па ўсёй краіне ў дзіцячых школах мастацтва скарыстоўваецца адзіная методыка выкладання. Усе работы мусілі так ці інакш распавядаць пра яблыкі. Хтосьці пайшоў найпрасцейшым шляхам — намаляваў нацюрморт з яблыкам, яблыкі на дрэве ці выяву яблыневага саду. Былі сюжэтныя кампазіцыі — збор ураджаю, яблыкі на святочным стале. Адлюстравана тэма дажынак, некаторыя карціны змяшчалі заклік пры вырошчванні садавіны абыходзіцца без хімікатаў. Сёй-той палічыў, што жнівеньскі яблык — гэта падстава паразважаць пра сельскагаспадарчы каляндар і ўвогуле змены ў прыродзе, абумоўленыя набліжэннем восені, і намаляваў людзей у полі.

Не абмінулі ўвагаю юныя мастакі і казачныя сюжэты. Цікавай падалася мне работа сімвалічнага зместу: выява яблыні, палова якой у леце пад сонечнымі промнямі, а другая — без лістоты пад восеньскім дажджом. Былі тыя, хто звярнуўся да вобразаў роднай прыроды, звыклых нам раслінаў і жывёлаў. Сярод іх мне запомнілася карціна, дзе зубры на зямлі і птушыны клін, што накіраваўся ў вырай, у небе — восень у Беларусі. У ёй нічога ад Чэрвенца / Яблычнага Спасу, але ў наяўнасці зразумелы і пераканаўчы (наколькі гэта магчыма ў фармаце дзіцячага малюнка) вобраз радзімы. Кажуць, усё геніяльнае проста. Тут надзвычай проста спалучаны два звыклыя, нават банальныя чыннікі, але атрымалася і наша краіна, і наша прырода. Калі пайсці ў развагах далей, дык знойдзем у дзіцячым малюнку недзіцячую філасафічнасць. Мяркую, не кожны прафесійны мастак дадумаецца да такога сюжэту.

Зрэшты, каб на замоўленую тэму зрабіць выставу прафесійнага мастацтва, атрымаўся б аналагічны расклад тэм і сюжэтаў. Гэта натуральна, бо дзіцячы свет фарміруецца пад уплывам дарослых, а дарослы чалавек — тое ж дзіця, хіба што з большым досведам. Праўда, на "дарослай" выставе дамінаваў бы яблык не з бабулінага / дзядулінага саду, а з саду Эдэмскага. Тут можна канстатаваць, што і ў дзяцей, і ў дарослых усё ж такі рознае ўяўленне пра Рай. К

Увага! Аб'ява!*

Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

— старшы выкладчык кафедры малюнка;
— прафесар кафедры прамысловага дызайну;
— дацэнт кафедры касцюма і тэкстылю.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас:

220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў, тэлефон: 366-93-41.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ілья Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІН Ірына Аляксееўна; **першы намеснік дырэктара** — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна. Тэлефон прыёмнай: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2017. Наклад 4 019. Індэксы 63875, 638752 Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 25.08.2017 у 17.00. Замова 3023. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Эквівалент запатрабаванасці

24 жніўня адбылася Рэспубліканская педагагічная рада з удзелам Прэзідэнта і прадстаўнікоў урада. На ёй ішла гаворка пра тое, як удасканаліць сістэму адукацыі ў краіне, зрабіць яе больш эфектыўнай і адпаведнай рэаліям суверэннай дзяржавы ў глабальным свеце. Між тым, ужо на наступным тыдні ў ВНУ культуры і мастацтваў прыйдзе новая хваля студэнтаў. Як сведчыць статыстыка, сёлетняя ўступная кампанія абышлася без вялікіх сюрпрызаў.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Эвалюцыя прэстыжнасці

Тое, што мы сёння маем у гэтай сферы, у значнай ступені ўяўляе з сябе спадчыну савецкай эпохі, якую ў нашай краіне — пры непазбежных стратах шэрагу пазіцый — усё ж такі здолелі ў лепшых рысах захаваць. Застаўшыся сам-насам са сваімі праблемамі, лічы, ва ўсіх галінах сацыяльнай практыкі, мы не спакусіліся на рызыкоўныя авантуры з навучальнымі праграмамі і методыкамі выкладання, якія, нібыта, абяцалі імгненную адаптацыю да новых рэалій. Можа, таму сёння і маем даволі эфектыўны шматузроўневы навучальны комплекс — ад дашкольнага выхавання да вышэйшых навучальных устаноў і сістэмы павышэння кваліфікацыі дыпламаваных спецыялістаў.

Але адна справа — быць часткай сістэмы, якая рыхтуе кваліфікаваныя кадры для ўсяго свету ад Балтыкі да Ціхага акіяна, іншая — засяродзіцца на патрэбах кампактнай еўрапейкай краіны, якой з'яўляецца Беларусь. Пра наспелае рэфармаванне сістэмы адукацыі і гаварыў Прэзідэнт на Рэспубліканскай педагагічнай радзе. Пры гэтым Кіраўнік дзяржавы даў зразумець, што "шокавая тэрапія" для беларускай грамады непрымальная: мы не будзем руйнаваць жыццядзольнае, але адновім страчанае. Зразумела, з улікам новых рэалій.

Нават у часы заняпаду эканомікі культура і мастацтва застаюцца канвертуемым капіталам дзяржавы. Пры гэтым трэба браць да ўвагі, што культурныя працэсы маюць сваю логіку, і час ад часу ў мастацтве змяняюцца эстэтычныя і сэнсавыя арыенціры. Гэта ў сваю чаргу адбіваецца на ўзроўні актуалізацыі тых ці іншых творчых спецыяльнасцей — і, зразумела, на лічбах конкурсу абітурыентаў у трох ВНУ, якія рыхтуюць кадры для культуры і мастацтва.

Да прыкладу, згадаю, што быў час, калі ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер — Акадэмія мастацтваў) аддзяленні, якія рыхтавалі жывапісцаў, графікаў і скульптараў, былі для абітурыентаў больш прывабнымі і прэстыжнымі, чым тыя, дзе вучылі дызайну і мастацтву дэкаратыўна-прыкладному. Сёння ж іх рэйтынг, лічы, зраўняўся, некаторыя спецыялізацыі дызайну нават апярэджваюць паводле папулярнасці класічную трыяду жывапіс-графіка-скульптура.

Студэнтамі Акадэміі мастацтваў сёлета сталі 184 чалавекі.

У Акадэмію музыкі залічана 150 чалавек. Яшчэ 22 будуць вучыцца ў магілёўскім філіяле.

Універсітэт культуры прыняў 808 першакурснікаў.

Не надта высокі, але стабільны

Сёлета, па афіцыйных звестках, агульны конкурс па БДАМ захаваўся стабільна высокім — хаця па некаторых спецыяльнасцях ёсць і рэгрэс. У сукупнасці, была пададзена 391 заява. Для параўнання: летась — 444. На кожнае месца прэтэндавалі чатыры чалавекі (у 2016 — 4,75). На дзённай форме навучання конкурс быў 2,9 чалавекі, на завочнай — 5,1.

Традыцыйна высокім конкурсам адзначаецца спецыяльнасць "Акцёрскае мастацтва" (11,4 чалавека на месца!). Далей з вялікім адрывам ідуць "Графічны дызайн" (3,0) і "Дызайн віртуальнага асяроддзя" (2,7). На розных спецыяльнасцях факультэта экранных мастацтваў (інакш кажучы, кіно і тэлебачанне) конкурс вагаецца ад 3,8 да 5,0. Ніжні радок рэйтынгу — "Рэжысура тэатра" (1,5), "Мастацтвазнаўства (арганізацыя тэатральнай дзейнасці)" з 1,2 і "Скульптура" (1,4). Мэтавы набор сёлета не ажыццяўляўся з прычыны адсутнасці заявак.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва ахоплівае больш шырокую сферу, чым Акадэмія мастацтваў. Я сказаў бы, што ягоныя выпускнікі шчыруюць у "дэмакратычным" сегменце культурнай праграмы, у той час, як выхаванцы акадэміі бліжэй да "элітарнай" дзейнасці. Хоць у дадзеным выпадку і "дэмакратызм" і "элітарнасць" даволі ўмоўныя. Ва ўніверсітэце конкурс на бюджэтную форму складаў 2,2 чалавека на месца. Найбольш запатрабаванымі аказаліся "Культуралогія" — 3,7, але два папярэднія гады конкурс тут быў вышэй. А вось паказчык 3,7 чалавека на месца па "Сацыяльна-культурнай дзейнасці" — гэта болей, чым у 2015 і 2016 гадах. "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)" з 2,9 прыблізна адпавядае леташняму ўзроўню.

Конкурс на рэжысуру святаў пераадолеў леташні спад (1,7) і вярнуўся на дакрызісны ўзровень, дасягнуўшы амаль трох чалавек на месца. Стабільным попытам карыстаюцца таксама "Харэаграфічнае мастацтва" (2,55) і "Культурная спадчына і турызм" (2,35).

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі сярэдні конкурс на працягу апошніх гадоў вагаецца ў межах 1,3 — 1,5 чалавека на месца. Гэта і нядзіўна, бо за права на кансерваторскую адукацыю зазвычай змагаюцца не пачаткоўцы, а ўжо даволі сфармаваныя музыканты, якія маюць адукацыю сярэдне-спецыяльную. А такіх, лішне казаць, не можа быць шмат.

Найбольшую папулярнасць традыцыйна мае спецыялізацыя "Акадэмічныя спевы", дзе на кожнае месца звычайна прэтэндуюць два і болей чалавекі. Таксама папулярныя ў абітурыентаў фартэпіяна, харэаграфія, кампазіцыя, духавыя і ўдарныя інструменты, музыказнаўства.

Канкурэнцыі ніхто не адмяняў

Пракаментаваць вынікі ўступных экзаменаў у ВНУ культуры і мастацтва наш карэспандэнт папрасіў рэктара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярыну ДУЛАВУ. Тое, што яна казала пра музычную адукацыю, на маю думку, амаль цалкам стасуецца з сітуацыяй і ва Універсітэце культуры і мастацтваў, і ў Акадэміі мастацтваў.

Рэктар Акадэміі музыкі Кацярына Дулава.

Спадарыня Кацярына лічыць, што творчыя спецыяльнасці маюць шмат агульнага са спортам, дзе на поспех можна разлічваць толькі тады, калі талент будучага чэмпіёна будзе заўважаны ў раннім дзяцінстве, і таму пашчасціць трапіць у рукі добрага трэнера. Маніторынг талентаў трэба пачынаць як мага раней. А яшчэ неабходна дбаць пра тое, каб будучы музыкант, мастак ці тэарэтык мастацтва не толькі атрымаў прафесійныя веды, але і развіў чалавечыя якасці, неабходныя ў жыцці і творчасці. Выпускнік творчай ВНУ мусіць ведаць: з атрыманнем дыплома яго адукацыя не завяршаецца — ды не разлічваць на бесклапотнае жыццё. Зусім не абавязкова там, куды ён трапіць па размеркаванні, яму адразу створаць спрыяльныя ўмовы для творчай самарэалізацыі.

Канкурэнцыі ніхто не адмяняў, і трэба быць гатовым да таго, што за бонусы і преферэнцыі, за прэстыжную працу і высокі статус трэба змагацца. На жаль, маладыя прафесіяналы да гэтага не заўжды падрыхтаваныя. Не ўхваляе Кацярына Мікалаеўна і тых, хто едзе па грошы і творчае самасцвярджэнне за мяжу: на яе думку, там можа годна ўладкавацца толькі той, хто нешта ўяўляе з сябе на Радзіме.

Пры гэтым рэктар Акадэміі музыкі лічыць, што на дзяржаўным узроўні павінны быць здзейснены захады па ўмацаванні сацыяльнага і матэрыяльнага статусу работнікаў культуры. Людзі лепей працуюць, калі ведаюць, што іх праца запатрабаваная. І запатрабаванасць тая выяўляецца таксама і ў матэрыяльным эквіваленце. Зрэшты, пра гэта гаварыў і Прэзідэнт на Рэспубліканскай педагагічнай радзе.

К

"Хаджэнні" чатырох мастакоў

Фрагмент экспазіцыі ў музеі.

У лютым гэтага года беларускія мастакі здзейснілі падарожжа ў Індыю. Вынікам гэтай "творчай камандзіроўкі" стала выстава IND-БЕЛ-ART, якая нядаўна адкрылася ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Яна прымеркавана да Дня незалежнасці Індыі і 25-гадовага юбілею ўсталявання дыпламатычных адносінаў паміж нашымі краінамі.

Без сумневу, стасункі тыя насамрэч маюць куды даўнейшую гісторыю. Цвярскі купец Афанасій Нікіцін, які здзейсніў з 1466 па 1472 год падарожжа ў Індыю, вяртаўся на радзіму па Дняпры, спыняючыся ў беларускіх гарадах. Напэўна, ён сустракаўся з гандлёвымі людзьмі, апавядаў ім пра свае далёкія вандроўкі. А ягоны твор "Хаджэнне за тры моры" быў папулярны і на нашых землях.

Цяпер такое "хаджэнне" — зразумела, з дапамогай ужо сучасных транспартных сродкаў — здзейснілі беларускія мастакі Рыгор Сітніца, Юрый Хілько, Дар'я Бунеева і Вера Ягоўдзік. Ім давялося ўбачыць тыя самыя адметнасці, якія ў свой час апісаў Нікіцін: Тадж-Махал, Элору, Аджанту, наведаць шэраг музеяў і галерэй, азнаёміцца з сістэмай мастацкай адукацыі Індыі, наладзіць асабістыя кантакты з калегамі па цэху. Вядома, захопленыя экзатычным хараством творцы занатоўвалі свае ўражанні ў выглядзе накідаў і эскізаў, а ўжо дома, у сваіх майстэрнях увасобілі іх у завершаныя творы. Менавіта яны і дэманструюцца на выставе.



Дар'я Бунеева. "Вандроўка. Індыя-8".

Апрача карцін, у экспазіцыі можна ўбачыць і прадстаўленыя Пасольствам Індыі ўзоры традыцыйных рамёстваў — сары, статуэткі з метала, кубкі ды іншыя рэчы, а таксама кнігі пра гэтую поўную загадак краіну. Без сумневу, дзякуючы гэтаму праекту яна стала бліжэй да зацікаўленай беларускай публікі.

Іван АРХІПАЎ

Калонка рэдактара

Музейная кантрабанда

Папярэдняя мая калонка выклікала дыскусію: у чым галоўная функцыя музейшчыка? Дбайна зберагаць факты і артэфакты? Альбо рабіць акцэнт на іх папулярызацыі — і, у рэшце рэшт, проста быць запатрабаванымі?

Ілья СВІРЫН

І тут узнікае тонкая дыялектыка. З аднаго боку, да музея нельга ставіцца выключна з прагматычнага гледзішча, звужаць яго ролю толькі да “абслугоўвання насельніцтва”, а эфектыўнасць вымяраць прададзенымі квіточкамі. Як вядома, гэтых місій шмат, і адна з найважнейшых — выступаць у ролі медыятара паміж пакаленнямі, знаходзячыся як бы трошачкі па-над часам. Бо тое, што не надта запатрабавана сёння, можа раптам вельмі спатрэбіцца нашым нашчадкам. Гісторыя нас гэтаму навучыла: адмовіўшыся ў савецкі час ад “не нашых” партрэтаў Радзівілаў, карцін Шагала ды іншых скарбаў, мы цяпер кусаем локці.

Але, з другога боку, — калі музей існуе, значыць, ён камусьці, усё ж, павінен быць патрэбным. У сэнсе, камусьці з сучаснікаў.

Музеі, прысвечаныя асобам першай велічыні, апрыёры знаходзяцца ў прывілеяваным становішчы — яны наўрад ці рызыкуюць застацца без наведвальнікаў. “У госці” да Коласа, Шагала альбо Міцкевіча нехта прыйдзе заўсёды. Іншая справа — з тымі кантэкстамі, якія сучаснікамі пакуль належна і адэкватна не асэнсаваныя. Напрыклад, сацрэалістычнае мастацтва, яркім прадстаўніком якога з’яўляўся Заір Азгур. Многія яшчэ не разумеюць, як належыць да яго ставіцца, і таму альбо проста не цікавяцца, альбо і наогул асуджаюць разам з усёй эпохай.

Што рабіць музейшыкам у такім выпадку? Скласці рукі і абмяжоўвацца выціраннем пылу на стэлажах? Ці вынаходзіць нестандартныя спосабы зацягнуць да сябе аўдыторыю, упіхнуўшы ёй уласны кантэкст своеасаблівай кантрабандай?

Не так даўно давялося пабываць на бадай самай нетыповай на маім веку музейнай імпрэзе. У былой майстэрні Заіра Ісакавіча, сярод соцень ягоных твораў (ну, вы ж уяўляеце, каго ён пераважна ляпіў!), цэлую ноч святкавалі дзень нараджэння лідара культавага гурта Joy Division Яна Кэртыса. Магу паспрачацца, што большасць прысутных ніколі б не апынуліся ў гэтым музеі (наўзбоч ад цэнтральных вуліц) у якасці звычайных наведвальнікаў.

— Я тут упершыню, клёвае месца! — дзеліцца ўражаннямі хлопец, які падышоў да мяне стральнуць цыгарэтку. — Нават не даеш веры, пабачыўшы такое ў дзяржустанове! Увогуле, выдатна, што ў Мінску цяпер такі магутны рух, што моладзі ёсць куды пайсці. Нават ужо і ў візе няма патрэбы!

Стратэгія, абраная кіраўніцтвам музея Азгура, дакладная і прадуманая. Праводзячы зусім надпаведныя, здавалася б, сваёй тэматыцы імпрэзы, яны заваблiваюць патэнцыйна зацікаўленых наведвальнікаў. А тыя хоцькі-няхоцькі знаёмяцца і з самой экспазіцыяй — ненавязліва, нібы ў даважак. Прычым яна ні ў кога не выклікае адпрэчвання — нягледзячы на стаўленне многіх да ідэйнага кантэксту саміх твораў.

Апошнія пару гадоў падобнага прынцыпу прытрымліваецца і музей Петруся Броўкі. І таксама паспяхова — хаця яшчэ параўнальна нядаўна нават гучалі прапановы яго зачыніць па прычыне незапатрабаванасці.

Зрэшты, у гэтай стратэгіі не было б нічога надзвычайнага, калі б не яе выкшталцонасць у дэталях. Адна справа — зрабіць у музеі рэвалюцыйнай тэматыкі, скажам, камерцыйную выставу матылькоў, а зусім іншая — прапаноўваць арыгінальны і якасны культурны прадукт. Апошняе — шматкроць больш складана і рызыкоўна. Вядома, музею неабходна рухацца, але вельмі важна, каб гэта быў не рух уніз — да спрашчэння і паніжэння планкі. Убок — можна, аднак галоўнае вытрымліваць узровень.

Як падаецца, савецкага скульптара і постпанкавага паэта (пры ўсёй іх відавочнай непадобнасці) лучыць, прынамсі, адно: грунтоўнае, бадай філасафічнае стаўленне да свету і свайго ў яго ўнёску. Пачытаўшы тэксты абодвух культавых персон, разумееш, што, напэўна, Азгур і Кэртыс знайшлі б агульныя тэмы для гутаркі. К

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па гэтай ды іншых тэмах нумара!
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by.
Тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97. **Абмяркоўвайце** на акаўнтах **kimpressby** у сацыяльных сетках!

Лічбы пакуль не радуюць

На які заробак можа разлічваць культработнік?

Вакантнае месца, як вядома, доўга пуставаць не будзе. У тым ліку — і ў сферы культуры Беларусі. Шматлікім айчынным музеям, бібліятэкам, клубам час ад часу патрабуюцца новыя супрацоўнікі, пра што і паведамляецца як у рэспубліканскіх базах вакансій, службах занятасці, так і ў абвестках на інтэрнэт-старонках саміх устаноў культуры. “К” вырашыла “прайсціся” па гэтых адрасах і паглядзець, колькі ж сёння гатовы плаціць у Мінску і па-за межамі МКАД супрацоўнікам сферы культуры. Аказалася, што не так многа, як хацелася б.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

“Абрэзаная” прэмія

Грашовае дрэва, якое так і не адшукаў Бураціна, наўрад ці сёння можна знайсці і спецыяліст у сферы культуры Беларусі. Бо што ні кажы, а заробкі, якія цяпер прапануюцца бібліятэкарам, дырэктарам клубаў ці музейшчыкам, далёкія ад сярэдніх па краіне. Для тых, хто не зусім у тэме, патлумачу: паводле афіцыйных звестак, намінальны налічаны сярэдні заробак у Беларусі ў чэрвені склаў 819,3 рубля. А супрацоўнікі бібліятэк, архіваў і музеяў ды іншых устаноў галіны атрымалі ў тым жа месяцы толькі 452,6 рубля.

Вось толькі некалькі даволі гаваркіх лічбаў і фактаў, якія змяшчаюцца ў Агульнарэспубліканскім банку вакансій: у Рэчыцкім раёне з канца ліпеня шукалі дырэктара Холмецкага цэнтра культуры і рамёстваў на заробак у 320 рублёў, а ў Бярэзінскім раёне Міншчыны прапаноўвалі кандыдату, які мог бы ўзначаліць Пагосцкі СДК, 265 рублёў.

Прыкладна такія ж заробкі, па словах дырэктара Плябанаўскага дома культуры Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці Аляксандра Бабіна, прапануюцца культработнікам і ў яго рэгіёне.

— Скажам, згодна з базай сайта vaukavysk.regiony.by, на сёння ў раёне патрэбны рэжысёр (на заробак у 320 рублёў), хормайстар, культарганізатар, акампаніятар (усе — на заробак у 280 рублёў) на працу ў Ваўкавыскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці, — адзначыў кіраўнік сельскага клуба. — Думаю, што ў іншых раёнах Беларусі супрацоўнікі сферы культуры атрымліваюць столькі ж, бо заробак у нашай сферы не можа быць большым.

Акрамя таго, кіраўнік сельскага клуба закрануў у размове і іншыя аспекты пытання з заробкамі.

— Трэба ўлічваць і той факт, што ў нашым раёне цяпер адзначана невыкананне плана пазабюджэтных даходаў, адпаведна, у многіх клубных работнікаў абразаюцца надбаўкі да заробкаў, — кажа Аляксандр Бабін. — Напрыклад, за 6 месяцаў бягучага года мой клуб зарабіў 14 тысяч 400 рублёў, усе астатнія сельскія клубы — 6 тысяч рублёў (агульная лічба — 20 400 рублёў), а трэба было, паводле даведзеных планавых паказчыкаў, зарабіць 25 тысяч рублёў на ўсіх. Адпаведна цяпер клубнікаў пакінулі без даплат, у тым ліку — і тых, хто працуе ў маім клубе, хоць свой даведзены план мы выканалі і нават перавыканалі.

Так што, як бачна, не заўсёды супрацоўнікі сферы культуры маюць і тыя заробкі, якія агаворваюцца падчас найму на працу. Шмат што залежыць ад выканання плана, паспяховай (ці не вельмі) працы калег і многіх іншых фактараў. Адпавядаць кожнаму з даведзеных параметраў бывае і складана, і часам проста немагчыма, бо шмат тут залежыць не ад цябе. Такая ж сітуацыя назіраецца не толькі ў культуры, але і ў іншых сферах эканомікі, бо, як вядома, адзін у полі не воін. Хоць, натуральна, пад адзін грэбень прычэсваць усіх таксама не варта.

Што музейшчык, што бібліятэкар

Дарэчы, словы Аляксандра Бабіна пра даволі сціплыя заробкі культработнікаў пацвердзілі і іншыя мае суразмоўцы. Напрыклад, як адзначыла мне дырэктар Музея народнай творчасці “Бездзежскі фартушок” Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці Марыя Астаповіч, у яе ўстанове на сёння ёсць вакансія наглядчыка музея.

— Заробак у месяц складае 280 рублёў з усімі надбаўкамі, — кажа візаві. — З дадатковых “плюсаў” адзначу, што для будучага супрацоўніка мы можам прадаставіць месца ў інтэрнаце.

Такія ж, на жаль, не надта вялікія заробкі прапануюць і работнікам сферы культуры на Міншчыне. Напрыклад, па словах дырэктара Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева Алены Капыток, заробак у бібліятэкараў усюды аднолькавы.

— На сёння гэта прыкладна 265 рублёў, — распавяла Алена Сяргееўна. — Тым, хто працуе ў сельскай мясцовасці, а таксама маладым спецыялістам прадугледжаны даплаты да гэтай сумы. Да таго ж, важны стаж работы і адукацыя супрацоўніка: ад гэтага таксама заробак можа крыху павялічыцца.

У бібліятэцы магчымы і некаторыя матэрыяльныя стымулы для супрацоўнікаў. Па-першае, заключэнне доўгатэрміновага кантракта (што дае невялікі дадатак да акладу) і, па-другое, пяць дадатковых дзён да адпачынку.

— У нашым калектыўным дагаворы прапісаны як сістэма сацыяльных адпачынкаў, так і сістэма прэміравання, — кажа суразмоўца. — А вось з жыл-

Слова пра мову.

Я цяпер нават не журналістам сябе пачуваю, а настаўнікам (па дыпломе і сямігадовай працы ў сталічнай СШ № 209). Пачуваю настаўнікам роднай мовы і літаратуры не ў старэйшых класах, а ў пачатковых, бо гаворка — пра рэчы элементарныя і зразумелыя, калі не ўсім, дык многім. Мы — беларускі народ, які збольшага размаўляе па-руску. Чаму так здарылася, даўно і ёміста патлумачылі іншыя. Як з сітуацыі выходзіць? Трэба вучыцца калі не любіць, дык паважаць тое, што засталося ад Скарыны і Каліноўскага, Купалы і Багдановіча, Чорнага, Танка і Брыля... Яны не ўмелі хлусіць, і я ім веру. Дык як навучыцца паважаць сваю мову? Пра гэта — і гаворка.

Яўген РАГІН / Фота аўтара

Родная мова — рэч самадастатковая. Яна, стомленая векавымі “ўдасканаленнямі”, цяпер сама выбірае, каму падабацца, а каму — не. У гэтым — гарантыя яе вечнасці. Нават калі сыдзе з гэтага жыцця апошні носьбіт — застануцца кнігі. Будзем спадзявацца, што такой “кансервацыі” мы ўсё ж пазбегнем. Зразумела адно: калі нацыя не карыстаецца мовай, яна — проста народ. (Які збольшага гаворыць па-руску.) Вельмі складана казаць у такіх умовах пра нацыянальную бяспеку. Ідэалагічны хіб — відавочны.

У кожнага — свой шлях да нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. І гэта кепска. Плойму сённяшніх беларускамоўных пісьменнікаў (Віктар Шніп, Андрэй Федарэнка, Барыс Пятровіч, Эдуард Акулін…) зрабіла вясковая беларускамоўная школа. Мне не пашчасціла: маю беларускую школу ў Ветцы, калі я сабраўся ісці ў першы клас (другая палова 1960-х), акурат зрабілі рускай. Добра памятаю, як да маці — выкладчыцы беларускай мовы і літаратуры — прыйшла яе каляжанка цётка Ніна і горка плакала з той нагоды, што матэматыку прыйдзецца выкладаць па-руску, а яна тэрміны кепска ведае. Нават беларуская мова выкладалася па-руску. Маці адмовілася стаць настаўніцай у маім класе па маральных меркаваннях. Яна, прынцыповая, вучыла мяне дома. Таму вырасла тое, што вырасла. Я з маленства ведаў пра рэпрэсіі, пра тое, што ці не ўся беларуская інтэлігенцыя была вынішчана ў часы сталінскага царавання, што мова наша — не горшая за іншыя, проста яна свая, адзіная. Гэтыя веды пастараўся

лём сёння, на жаль, складана. Скажам, у вёсцы не так ахвотна здаюць пакоі ці хаты нашым спецыялістам, як раней. У горадзе праблем з жыллём крыху меней — імкнемся вырашыць гэтае пытанне праз інтэрнаты. Але большасць нашых супрацоўнікаў жыве або з бацькамі, або сваімі сем'ямі.

Як дадала Алена Капыток, адкрытых вакансій у яе бібліятэцы цяпер няма. Сёлета ва ўстанову культуры прыйшлі маладыя спецыялісты, яны замянілі калег, якія сышлі на пенсію. Вырашаецца пытанне з вакансіяй экскурсавода ў аддзел галерэйна-выставачнай дзейнасці.

Дарэчы, пра адсутнасць вольных вакансій казалі мне і ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку.

— Праўда, сёлета мы ўзялі па замове двух гісторыкаў з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, — адзначыла дырэктар установы Тамара Джумантаева. — 5 нашых навуковых супрацоўнікаў сёння знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе за дзецьмі, а на іх месцах працуюць часова ўладкаваныя спецыялісты.

Што да заробкаў, дык, па словах візаві, стаўка ў музеі-запаведніку даволі малая.

— У сярэднім за ліпень заробак па ўстанове склаў 530 рублёў, — кажа Тамара Джумантаева. — З дадатковых стымулаў магу адзначыць магчымасць арэнды жылля (свайго ў нас няма), а таксама падвышэнне кваліфікацыі спецыялістаў за кошт установы.

Дадам, што агучаны дырэктарам Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка заробак, калі параўнаць з ранейшымі лічбамі, якія маюць у сваіх разліковых аркушах іншыя мае суразмоўцы, усё ж такі настройвае больш на аптымістычны, чым песімістычны лад. Хаця і ў гэтым выпадку да сярэднестатыстычных 800 рублёў таксама не так ужо і блізка.

намінальны налічаны сярэдні заробак у Беларусі ў чэрвені склаў

819,3

АПОШНІЯ ДАНЫЯ ПА ВАКАНСІЯХ СУПРАЦОЎНІКАЎ КУЛЬТУРЫ ЯК У МІНСКУ, ТАК І Ў РЭГІЁНАХ БЕЛАРУСІ:

для бібліятэкара 265

для музейшчыка 280

А што ў сталіцы?

Цікава, што сталічныя супрацоўнікі сферы культуры таксама не надта шыкуюць на сваіх пасадах. Скажам, паводле партала Rabota.tut.by на пачатак жніўня ў Мінску патрабаваліся супрацоўнікі як у бібліятэкі, так і ў музеі менавіта з невялікімі заробкамі.

Напрыклад, Дзяржаўнаму музею гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь патрабуецца навуковы супрацоўнік. Аплата, якую абяцаюць ва ўстанове, не надта адрозніваецца ад той, што прапаноўваюць у раёнах Беларусі: усяго толькі ад 250 рублёў "на рукі", гэта значыць чыстымі. Вопыт працы не патрабуецца, а ў абавязкі будучага супрацоўніка ўваходзіць правядзенне экскурсій у музеі і школах, а таксама напісанне артыкулаў у СМІ, навуковых паведамленняў, лекцый па тэматыцы музея.

Дзіцячая сталічная бібліятэка № 6 імя В.Віткі, што на вуліцы Карла Лібкнехта, 98, абяцае будучаму супрацоўніку-бібліятэкару ад 300 рублёў "на рукі". Ад прэтэндэнта патрэбны вопыт працы (ад 1 да 3 гадоў), камунікабільнасць і ўменне ладзіць масавыя мерапрыемствы.

І ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі заробкі не нашмат вышэйшыя. Галоўная "кніжніца" краіны шукае рэдактара інтэрнэт-партала і можа прапанаваць не больш за 450 — 550 рублёў "брудным" (гэта значыць да вылічэння падаткаў) за месячную працу. У якасці бонусаў — суміраваны графік работы, які ў некаторых выпадках можа вар'іравацца, а таксама поўны сацпакет і бясплатнае карыстанне абанементам Нацыяналкі. Праўда, замовіць любыя ўпадабаныя кнігі на месяц-другі можна толькі пасля праходжання трохмесячнага выпрабавальнага тэрміну.

Так што, як бачна, і ў сталіцы заробкі ў бібліятэкараў не такія ўжо і вялікія. Праўда, згодна з нядаўняй спецыяльнай Пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь № 40 супрацоўнікам Нацыянальнай бібліятэкі і Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі са жніўня бягучага года паднялі аклады ў сярэднім на 50 % і 30 % адпаведна. Так што заробкі ў гэтых дзвюх установах падвысяцца. Можа, з цягам часу гэта закране і іншых сталічных культработнікаў?

У тым жа банку вакансій я знайшоў шмат прапаноў ад прыватных арганізацый, якія зазываюць да сябе на працу супрацоўнікаў сферы культуры. Вось, напрыклад, КФХ "Панскі маёнтак" шукае аніматара-экскурсавода ды артыста-аніматара, якія маглі б ладзіць экскурсіі ды ўдзельнічаць у мерапрыемствах "Парка-музея інтэрактыўнай гісторыі Сула" ды сядзібе-музеі роду Ленскіх. Заробак, які абяцае прыватнік, — 500 — 600 рублёў "на рукі", транспартныя выдаткі аплочваюцца працадаўцам (музей знаходзіцца за 20 кіламетраў ад Дзяржынска і за 50 кіламетраў ад Мінска).

Як бачна, прыватныя арганізацыі культработнікаў цэняць і гатовы плаціць ім нашмат больш, чым у дзяржаўных структурах. Можа, гэтая барацьба за месца пад сонцам і за высокакваліфікаваныя кадры паўплывае і на заробкі ў дзяржаўных установах культуры? Хацелася б верыць. У адваротным выпадку вынік прадказаць не цяжка: таленавітыя і крэатыўныя супрацоўнікі пачнуць сыходзіць да прыватніка. Але ж будзем аптымістамі.

К

Яшчэ адно. Не апошняе

перадаць і сваім сынам. Малодшы расказваў днямі, што ў іх на фірме стыхійна быў абвешчаны дзень беларускай мовы. Хтосьці чытаў вершы, хтосьці згадваў біяграфію Янкі Брыля, а хтосьці аналізаваў творчасць Рыгора Барадуліна. Мой (веру!) таксама з годнасцю вытрымаў імправізаваны іспыт. Значыць, можам, калі захочам. Толькі не заміналі б.

Інакш кажучы, формула паяднання з мовай простая: сям'я, школа, аблашчаныя дзяржаўнай увагай. Няпростым застаецца пакуль яе рашэнне. Адзін са складнікаў (а то і пара запар) пастаянна выпадае. Як, зрэшты, і ў гэтым ланцужку: беларускамоўныя садок — школка — універсітэт. Калі штосьці сістэмна і робіцца, дык толькі на голым энтузіязме. Не, працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі стрымаць нельга. Але часавы фактар у кожнай краіны тут — розны. У нас, нягледзячы на вышыванкі і курсы "Мова нанова", гэты працэс пакуль нагадвае застарэлы аселы снежны покрыў, які толькі падумвае пераўтварыцца ў імклівую лавіну.

Таму і моўныя памылкі вакол нас — ці не абавязковыя. Маўляў, рускую мы ведаем добра, а сваю родную — ну ніяк. З вучнёўскага сшытка памылкі арганічна і ўпэўнена перакачоўваюць у пашпарты, афіцыйныя абвесткі, шыльды, у рэкламу. І мы, як пачаткоўцы, няведанне правапісу свайго прозвішча па-беларуску апраўдваем па-дзіцячаму: "А так у пашпарце запісана". Вядома, што пашпарт запаўняла пашпартыстка, у якой нашу мову выкладалі па-руску. Дык ці паважаем мы сябе і сваю спадчыну? За мяжой сітуацыя выглядаецца ў межах бескампрамісна заканадаўства. Любая памылка адсочваецца, так бы мовіць, моўнай паліцыяй і абкладаецца немалым штрафам. Быць непісьменным нявыгадна.

"К" час ад часу піша пра шматлікія выпадкі няправільнага, мякка кажучы, ужывання нашай мовы на шыльдах, таблічках, рэкламных шчытах. Сітуацыя ў станоўчы бок не мяняецца. Як вісела шмат гадоў у суседнім двары шыльдачка з назвай вуліцы "Рафіява", так і вісіць. Грубая памылка на правіла "пераход "е" ў "я" ў першым складзе перад націскам". А ў нашым канкрэтным выпадку мы маем першы склад *пасля* націску, таму ніякіх пераходаў "е" ў "я"! І пісаць трэба "вуліца Рафіева". Ужо класічнай стала лексічная памылка ад Магілёўскага лясгаса на прыдарожных білбордах: "Кахайце наш беларускі лес". Кахаць можна жонку, а Радзіму, маму, лес — толькі любіць. Процьма памылак звязана з тым, што ігнаруецца *абавязковае* ўжыванне ў роднай мове "ё", а не "е", "ў", а не "у". І мы ў большасці не зважаем на гэта ніякай увагі. Маўляў, так і трэба, маўляў, сыдзе і так. Беларускаму кнігадрукаванню — 500 гадоў. А мы па-ранейшаму застаемся непісьменнымі.

Раней у рэдакцыю часцяком тэлефанавалі чыноўнікі самых розных гарадскіх інстанцый, цікавіліся, як правільна напісаць тыя ці іншыя тэкст, слова, сказ. Мы з ахвотай і бясплатна дапамагалі. Шматлікімі былі такія тэлефанаванні (ведаю дакладна!) і навукоўцам-мовазнаўцам. Цяпер тэлефоны маўчаць.

Калі ў сям'і гавораць па-беларуску, гэта, па маім меркаванні, толькі палова поспеху. Другую трэба шукаць у школьных метадычных кабінетах. Школьныя навучальныя праграмы па мове і літаратуры — гаворка асобная, доўгая і не вельмі прыемная.

Ці заплача ў бліжэйшы час маладая настаўніца матэматыкі з-за таго, што неўзабаве выкладанне пяройдзе на беларускую мову, а яна, настаўніца, не ведае беларускай матэматычнай тэрміналогіі?

К

Дзяжурны па нумары

Музыкалка алімпійскага рэзерву

Калі знаёмыя ганарліва распавядаюць, што адвялі дзіця ў музычную школу, я ўнутрана здрыгваюся. Памяць па-здрадніцку падкідвае абрыс стомленай піяністкі, вымушанай штотыднёва па раскладзе выслухоўваць, як яе вучні здзекуюцца з інструмента. Кожны ўрок настаўніца непрыхавана пакутуе, а вучні затоена прызываюць усе маланкі свету на гэтае абрыдлае за сем гадоў фартэпіяна… Сёлета наведвала сяброўку ў Германіі і на свае вочы пабачыла: усё ж такі ад музычнай школы можна атрымліваць задавальненне.

Настасся ПАНКРАТАВА

Мне ў дзяцінстве проста не пашанцавала. Мая настаўніца была віяланчэлісткай, таму "нагрузка" піяністамі ды небаракамі-харэографамі, для якіх тое фартэпіяна было дадатковым прадметам, радасці не прыносіла. З году ў год я цягала на заняткі адзін і той жа безаблічны нотны зборнік, усаджвалася пад тужлівым позіркам ля інструмента і на працягу доўгіх дзясяткаў хвілін спінай адчувала, як нудзіцца мой педагог. Адвечныя эцюды, санаты ды санаціны хутка перасталі выклікаць душэўнае трымценне, рукі ж скоўвала разуменне, што адным сваім з'яўленнем я адрываю настаўніцу ад тых гіпатэтычных анёлаў, у якіх вочы загараюцца ўжо ў той момант, як з-за дрэваў паказваецца будынак ДШМ. Я ж ледзьве ногі перастаўляла, ідучы туды, аднак збочыць не дазваляла сумленне, а кінуць тыя пакуты забараняла адукацыйная праграма.

У апошні год навучання мне нечакана змянілі педагога, і новаму ўдалося крыху адагрэць мае моцна замарожаныя пачуцці да інструмента. З горам напалам здала выпускны экзамен і больш ніводнага разу не падышла да піяніна. За самотных сем гадоў памяць рук не захавала нават "Сабачага вальса". Хутка жыццё сутыкнула мяне ўжо з музычнай школай: туды раз-пораз вадзіла на заняткі сваю кузіну. Ізноў пабачыла тугу ў вачах дзяцей, што пераміналіся пад кабінетамі з адчуваннем непазбежнасці іспыту музыкай. Хутка кузіна пачала гаварыць бацькам, што адзіны лішні прадмет у яе пакоі — занудлівае фартэпіяна.

Памятаю, што без прымусу не вырасла ніводнага вялікага музыканта. Але колькі ў працэнтных суадносінах навучэнцаў ДМШ, ДШМ, музычных аддзяленняў пры сярэдніх навучальных установах абіраюць музыку сваёй прафесіяй? Чаму ў нашай адукацыйнай сістэме да ўсіх дзяцей зазвычай ставяцца так, быццам яны прыйшлі ў школу алімпійскага рэзерву, дзе галоўнае — п'едэстал, а тых, хто такога выніку не дасягае, трэба паадсейваць? Можа, больш эфектыўна было б вымуштроўваць толькі тыя адзінкі, якім наканавана штурмаваць конкурсы ды прыёмныя камісіі? А астатнім сотням дзетак, якія вырашылі спрычыніцца да музыкі, можна ж дазволіць атрымліваць асалоду ад нотнага чараўніцтва. У такім выпадку ахвотных узяць у рукі інструмент адразу пабольшае. Маё знаёмства з нямецкай музычнай школай таму пацвярджэнне.

Сёлета давялося ў дзесяцітысячным нямецкім гарадку павесці сына сяброўкі на заняткі ў музычную школу. У немцаў валоданне інструментам уваходзіць у мінімальны набор уменняў любога добра выхаванага дзіцяці. Хобі нятаннае: кожны занятак каштуе 20 еўра, не прыйшоў на ўрок без паважлівай прычыны — будзь ласкавы ўсё роўна заплаціць. Але дзеці ляцяць у школу не з-за магчымых штрафаў: ім сапраўды падабаецца!

Школьны будынак агортвае ўтульнасцю і хатняй атмасферай: на двары пясочніца і невялічкі спартыўны комплекс, унутры ходзяць без абутку, бацькам дазваляюць бавіць час на кухні. Там я заспела дырэктара ўстановы за складаннем працоўных раскладаў, але гэтыя абставіны не перашкодзілі ёй спакойна пагутарыць са мной пра майго падапечнага.

У гэты час выйшла з кабінета сустракаць майго скрыпача-пачаткоўца яго настаўніца. Яна шчыра радавалася сустрэчы з хлопчыкам, падарыла і мне колькі прыемных словаў пра яго, потым на працягу трыццаці хвілінаў з-за дзярэй даносіўся расповед пра каўбоя, пра якога вучню неабходна сыграць на скрыпцы, гукі сумеснага музіцыравання, задаволены рогат абодвух. Урок скончыўся салодкім падарункам вучню. Настаўніца вывела квітнеючага хлопчыка да мяне і распавяла пра яго поспехі, добра разумеючы, што я не ягоная маці. Ці дзіва, што хлапчына не ўяўляе сабе жыцця без скрыпкі?!

Нюансаў у нямецкай сістэме таксама хапае. Мне падалося дзіўным, што ў тамтэйшай адукацыйнай праграме я не пабачыла сальфеджыа, хору ці іншага дадатковага прадмету, а ў раскладзе для дзяцей першых гадоў навучання ўрокі пастаўлены толькі раз на тыдзень. Аднак іх вучоба прасякнутая душэўнасцю, галоўная мэта — задавальненне ад самога працэсу авалодвання музычнымі ведамі. Розніца ў падыходах відавочная. Як і тое, чые дзеці будуць вяртацца да інструмента нават пасля заканчэння навучання.

К

Андрэй БАРЭЙКА: “Тое, што сёння называюць музыкай, часта з’яўляецца проста шумам”

На адной сцэне 103 музыканты — іграе міжнародны I, Culture Orchestra. Гэта быў чарговы вечар “Класікі ля Ратушы з velcom” на плошчы Свабоды ў Мінску, на якім гучалі Гектор Берліёз, Станіслаў Манюшка і, можна сказаць, эксклюзіў — нядаўна знойдзеная інструментоўка Ферэнца Ліста “Галіцыйскіх танцаў” польскага кампазітара Юліюша Зарэмбскага. Напярэдадні канцэрта дырыжор гэтага маштабнага праекта расіянін Андрэй БАРЭЙКА грунтоўна адказаў на нашы пытанні. А пачалі мы з сур’ёзнага — з тэндэнцый.

103 музыканты — міжнародны I, Culture Orchestra — выступілі ў мінулыя выхадныя ў Мінску на плошчы Свабоды.

— Фармат канцэрта на плошчы Свабоды, дзеля якога вы прыехалі ў Мінск, уліваецца ў тэндэнцыю сумяшчэння элітнага і масавага мастацтва — акадэмічная музыка гучыць падчас бясплатнай вулічнай дзеі. Як вы ставіцеся да таго, што класіка выходзіць за межы філармоній і канцэртных залаў?

— Мне падаецца, гэта сумяшчэнне выяўляецца выключна ў тым, што аркестр замест канцэртнай залы грае на вуліцы. Для каго? Для людзей, большасць з якіх не была і, магчыма, ніколі не будзе ў філармоніі, ім цікава ўбачыць нешта незвычайнае — альбо яны проста ішлі міма. У Амерыцы і на платныя канцэрты прыходзяць сем’ямі, сядзяць за столікамі, бавяць час з ежай і піцвом, а музыка з’яўляецца толькі дадаткам. Я не ідэалізую публіку і не будую паветраных замкаў, але перакананы, што падобныя імпрэзы трэба рабіць, інакш мы канчаткова замкнёмся ў вежы са слановай косці. Гэты працэс, на жаль, распачаўся ўжо даўно, класічныя музыканты сталі часткай нейкай эліты. Больш дакладна, нават не самі музыканты, а слухачы — яны абазнаныя і свядома прыходзяць на канкрэтныя імёны. Часта сярод публікі мне не хапае людзей, якім проста цікава паслухаць іншую музыку, у сем’ях якіх не было традыцыі наведваць філармонію, а бацькі выключалі тэлевізар падчас сімфанічных канцэртаў.

— Ці пойдзе наведвальнік бясплатнага канцэрту сімфанічнай музыкі на плошчы Свабоды наступным разам у філармонію?

— Я не вельмі ў гэта веру. З тых, хто будзе на канцэрце ўпершыню, можа, 5 — 10 працэнтаў калі-небудзь зноў прыйдзе на нешта падобнае, яшчэ менш людзей купіць білет у філармонію. Але мяне засмучае іншае — школа перастала займацца выхаваннем глабальным, хаця яна абавязана выхоўваць не толькі матэматыкаў, фізікаў, праграмістаў, разумных і таленавітых людзей у вобласці навукі і тэхналогіі. Я не ведаю, можа, у Беларусі па-іншаму, але ў Амерыцы ўвогуле з гэтым дрэнна, у Еўропе амаль паўсюль дрэнна, прычым ва Усходняй крыху лепш, чым на Захадзе. У Расіі раней у звычайнай агульнаадукацыйнай школе праводзіліся ўрокі музыкі і спеваў, дзеці ведалі, як выглядае скрыпка і чым яна адрозніваецца ад трамбона, ім распавядалі пра кампазітараў, але цяпер нічога падобнага ўжо няма. Возьмем нават такую культурную краіну, як Германія: мая дачка там хадзіла ў школу, і я неяк запытаўся, што яны праходзілі на ўроку музыкі. Як выявілася — гісторыю ансамбля “Бітлз”. Мяне бянтэжыць, што класіка — квінтэсэнцыя прыгожага, добрага, чалавечнага, адфільтраванага стагоддзямі — становіцца набыткам для ўсё меншай часткі людзей, хаця павінна быць наадварот. Яду становіцца ўсё больш, а супрацьяддзем, нават калі яно і ёсць, не карыстаюцца.

— Кажучы пра сферу музыкі, што ў ёй атрута?

— Па-першае, само паняцце музыкі размылася, і сёння пад ім часта маюць на ўвазе проста шум. Ёсць слова muzak — гэта тое, што гучыць у ліфце, універмагу, цырульні, да чаго людзі прызвычаіліся, як да фону. Праз пяць хвілін запытайся, што гэта было, — і ніхто не ўспомніць. Ёсць яшчэ такі кірунак, як new age — увогуле кашмар, бо ён створаны, каб быць недакучлівым, прыемным для слуха, усыпляльным, зноў жа, фонам. Тое, што я назваў, і далёка не толькі гэта, — не музыка, а атрута. Я сам іграў рок, джаз і ведаю, што ёсць таленавітыя музыканты, а ёсць бяздарныя, ёсць вельмі добры джаз і вельмі дрэнны. Альфрэд Шнітке казаў, што эстрада — а гэта ўсё для яго абазначалася словам “эстрада” — ад д’ябла. Я б так не стаў сцвярджаць, бо нават там робіцца шмат цікавага і сапраўднага. Таму я не супраць эстрады — я супраць замбіравання людзей гукамі, якія не маюць сэнсу.

— Вы казалі пра muzak. Але і класіка часам становіцца фонам — на фуршэтах, у крамах, падчас чакання адказу на тэлефонны званок. Сур’ёзная музыка такім чынам выходзіць у іншую сферу, што правакуе фарміраванне новага тыпу яе ўспрыняцця.

— Гэта эрзац. Як ёсць хлеб, а ёсць імітацыя хлеба, таксама ёсць Моцарт у канцэртным выкананні ў зале, а ёсць тое, што грае ў тэлефоне. Калі чалавек не можа дазваніцца, ён, нават не ведаючы гэтую музыку, пачынае яе не любіць, яна выклікае раздражненне — што ў дачыненні да класікі грае адмоўную ролю. Каб я быў начальнікам аддзела маркетынгу ў нейкай фірме, дзе трэба ставіць людзей у чаргу, я б паспрабаваў уключаць шумы прыроды — тое, што расслабляе, а не напружвае, бо голас прыроды нам нашмат бліжэйшы за любыя іншыя гукі.

Класіка гучыць таксама ў выкананні квартэтаў на вяселлях, якія часта граюць так сабе, бо гэта халтура, дадатковы заробак: сёння трэба адыграць чатыры вяселлі, заўтра сіл ужо няма, рукі не падымаюцца, а грошай зарабіць хочацца. Таму часта граюць, як могуць, а людзі думаюць, што гэта і ёсць класічная музыка. Калі чалавек пачуе Марш Мендэльсона ў дрэнным выкананні, ён наўрад ці прасякнецца любоўю да кампазітара.

Некалі я іграў на клавішных інструментах з выдатнымі джазавымі музыкантамі. Яны ведалі, што ў мяне кансерваторская адукацыя, што я пішу музыку, цікаўлюся дырыжыраваннем. Адпаведна іх густам я знайшоў такіх аўтараў XX стагоддзя — складаных для большасці слухачоў — праз якіх мае калегі зацікавіліся класікай. У выніку, наша творчасць пачала спакваля эвалюцыянаваць у бок Ігара Стравінскага і Белы Бартака. Два розныя стылі зблізіліся і нават сталі пранікаць адзін у другі. Зрэшты, той жа Джордж Гершвін пісаў музыку для сімфанічнага аркестра і ствараў знакамітыя песні, у Леанарда Бернстайна ёсць і сімфоніі, і джазавыя кампазіцыі. У 1910 — 1930-я класіка наогул вельмі зблізіліся з джазам. Ды і тых, хто любіць джаз, лягчэй прывабіць канцэртамі класічнай музыкі, чым тых, хто слухае, скажам, Рыгора Лепса і Філіпа Кіркорава. Нічога не кажу пра прафесіяналізм апошніх, ім таксама нялёгка, але гэта не тая музыка, якая цікавіць асабіста мяне.

— Не дзіўна, што вы высока ацэньваеце музычную адукацыю ва Усходняй Еўропе — гэта спадчына Савецкага Саюза, які праз класічную музыку атаясамліваў сябе з высокім. Адсюль і шматлікія музычныя школы, выязныя канцэрты філармоній, сімфоніі па тэлебачанні...

— У часы жалезнай заслоны ў Савецкім Саюзе было мала месцаў, куды можна пайсці, а тэлевізар паказваў у лепшым выпадку тры праграмы. Нешматлікія цікавыя перадачы людзі чакалі цэлы месяц, бо ўсё астатняе немагчыма было глядзець. У кінатэатрах, апроч сацрэалізму, амаль нічога не было. Тое ж самае і ў тэатрах. Замежныя музычныя калектывы нават з сацыялістычных рэспублік прыязджалі надзвычай рэдка. У тым ліку з-за гэтага класіка стала пэўным спосабам катарсісу, людзі слухалі і Густава Малера — не ведаючы нічога ні пра Аўстрыю, ні пра самога Малера — і нават Арнольда Шонберга. Цяпер я чытаю кнігу цудоўнага дырыжора Ігара Блажкова, які быў прапагандыстам сучаснай музыкі ў 1960 — 1970-я гады. Ён расказвае, што сімфонію Антона Вэберна іграў на біс. Цяжка сабе ўявіць, каб сёння дзе-небудзь сімфонію Вэберна іралі на біс. А тады была велізарная прага да пазнання.

Мая бабуля (яна была бібліятэкарам), калі ішла з раніцы на працу і ведала, што перад канцэртам не паспее зайсці дадому, брала з сабой чаравікі і панчохі, каб у філармоніі пераапранацца. Яна не магла ўявіць, што туды можна прыйсці ў нейкіх ботах і тоўстых цёплых рэйтузах. Так рабіла большасць жанчын, бо філармонія, без перабольшванняў, была храмам — ледзь не адзіным даступным для савецкага чалавека. У сапраўдную царкву тады не пускалі: ля яе дзяжурылі людзі з фотаапаратамі. На маім курсе двух чалавек выгналі з кансерваторыі і камсамолу толькі з-за таго, што яны пайшлі на велікоднае набажэнства.

Класічная музыка была больш чым проста музыкай — акно ў свет, магчымасць адчуць тое, што паўсядзённае жыццё не давала. Сёння ж у нас інтэрнэт, 150 тэлеканалаў, з канцэртамі прыязджаюць амаль любыя артысты, мы можам самі ездзіць, і таму класіка страціла сваю функцыю. Да ўсяго, яна перастала быць сродкам самааналізу, чалавек больш не шукае ў ёй адказы на свае пытанні.

— У якасці дырыжора вы працавалі ў розных краінах. Па вашых назіраннях, ці імкнуцца маладыя людзі зрабіць кар’еру на ніве акадэмічнай музыкі?

— Ці стануць маладыя людзі, што вырашылі прысвяціць сябе ігры на інструменце, сапраўднымі музыкантамі? Не ўсе, мне падаецца. Таму што імі можна стаць толькі ў добрым аркестры, а каб туды трапіць, трэба прайсці агонь, ваду і медныя трубы. Але тое, што частку свайго жыцця яны правялі з класічнай музыкай — безумоўна, вялікі плюс для іх і для іх будучых дзяцей. Я часта і ахвотна працую з маладзёжнымі аркестрамі, і кіраванне I, Culture Orchestra — яшчэ адна магчымасць раскапаць нейкую цаліну, бо для гэтых маладых музыкантаў усё новае, яны мала што ведаюць, многія з іх першы раз у жыцці граюць у аркестры. Яны быццам узаранае поле, у якое трэба ўкласці насенне. Гэта не засохлы такір — ведаеце, у Казахстане такая патрэсканая зямля, якую колькі ні палівай і нешта ў яе ні кідай — нічога не вырасце. Наадварот, яны адкрытыя і гатовы рэпетаваць нават больш, чым мы дамаўляліся. У іх вачах бачыш узрушанне ад таго, што пятнаццаць хвілін таму ўрывак гучаў так, а пасля дасягнення нейкіх поспехаў тое ж самае гучыць па-іншаму. Гэтыя маладыя людзі шчаслівыя, калі адчуваюць: тое, што яны робяць, падабаецца публіцы. Мы ў Варшаве адыгралі канцэрт: калі публіка раўла ад захаплення, яны ззялі.

Гутарыла Сафія ПАЛЯНСКАЯ

ГЭТА ВАМ НЕ РЫА, ГЭТА МІНСК

Філасофія street-art — з першых вуснаў

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Мне падаецца, што кожны street-мастак вольны выбіраць той шлях, які яму даспадобы. Калі я быў малады, натхняўся графіці, але потым прыйшоў да свайго стылю. Для мяне public art — гэта брама, якая адкрывае шлях да розных культур, дазваляе падарожнічаць, бачыць, як жывуць іншыя людзі.

Паняцце нацыянальнай ідэнтычнасці не страціла свайго сэнсу, але кожная культура ўзбагачаецца, калі яна поліэтнічная. У Мінску мне вельмі дзіўна бачыць прадстаўнікоў пераважна адной нацыянальнасці, бо Сан-Паўлу — гэта мультыкультурны кацёл, у якім віруюць самыя розныя народы. Сам я адчуваю сябе больш бразільцам, хоць і маю японскія карані. Толькі нядаўна мне ўдалося высветліць, што мае продкі — гэта не зусім японцы, а старажытныя насельнікі Японскіх астравоў — айны. Пра гэты народ мала вядома, яны толькі некалькі гадоў таму былі афіцыйна прызнаны нацыянальнай меншасцю ў Японіі.

У вашай краіне мяне ўразілі людзі, і асабліва валанцёры, якія дапамагалі мне з адкрытым сэрцам. Я ніколі не бачыў у жыцці такога чыстага горада — і, як ні дзіўна, мне гэта падаецца недахопам. Бо дзе ваша моладзь можа самавыяўляцца? Дзе яе слова сярод гэтай чысціні?

Рамон Марцінс працягвае распісваць сцяну на вуліцы Кастрычніцкай, 19\5.

Рамон Марцінс: "Дадаць колеру ў аблічча Мінска"

Будынак, які ён распісвае на вуліцы Кастрычніцкай, ужо займеў рознакаляровыя геаметрычныя фігуры і беларускую нацыянальную сімволіку. "Гэты сімвал азначае агонь!" — кажа мастак, трымаючы трафарэт, па якім ён размяркоўваў фарбу. Пано, якое ў мінулым годзе зрабіў Рамон, ужо сталася славутасцю Мінска. Ішла нават гаворка пра тое, каб уключыць роспіс у Кнігу рэкордаў Гінеса.

— Такая прапанова гучала, але пакуль справа яшчэ вырашаецца, — распавядае Рамон. — Калі ўсё атрымаецца, будзе здорава. Хаця для мяне важны не толькі падобнага кшталту поспех, але і рэакцыя людзей, якія жывуць тут. Колеры, якія я імкнуўся ўвесці ў ваш горад, выявы — маё пасланне маладому пакаленню. Для мяне стрыт-арт — найперш камунікацыя, і я спадзяюся, што імпульс, які я ўкладваю ў сваю працу, людзі адчулі.

Калі летась я пабачыў той вялізны гмах, які мне выпаў гонар распісваць, — дык проста ашалеў! Нічога сабе! Такі выклік вымусіў многае змяніць у маёй працы і падыходах. Па-першае, спатрэбілася дапамога асістэнтаў — да гэтай пары я працаваў адзін. Па-другое, маляванне ішло ў дзве рукі. Па-трэцяе, стала зразумелым, што патрэбны выявы, якія будуць бачныя здалёк, і ўсё гэта трэба зрабіць хутка. Вынік да канца быў трохі непрадказальным.

У дадзены момант я — на раздарожжы. З аднаго боку, выбраў колеры, якія люблю і якія для мяне важныя. З іншага, я чакаю пэўнага знаку ад Мінска, той вібрацыі, якая дасць мне штуршок маляваць. Для мяне істотны непасрэдны кантакт з горадам, з яго насельнікамі, якія даюць мне імпульс для творчасці. Мне хочацца паяднаць нейкім чынам Беларусь і Бразілію, але пакуль няма вобразу, які б мяне задаволіў.

Каб змяніць свет, стрыт-арт не абавязкова мусіць быць прыземленым і канкрэтным. Лічу, што калі мастак супраць вайны, яму не абавязкова маляваць ружжо ці гарматы. Мяне цяпер турбуюць праблемы экалогіі. Да прыкладу, зубр, які з'явіўся на пано ў Мінску, — гэта мой заклік да беларусаў берагчы свой прыродны свет. Прачытаў пра зубра ў Чырвонай кнізе, а каб намаляваць, паехаў у заапарк. Вельмі не люблю заапаркі, а калі яшчэ пабачыў гэтага неверагодна прыгожага звера ў няволі, шчыра кажучы, заплакаў. Мне было важна выявіць яго на мураве — гэта ж ваш сімвал! Беражыце яго!

Я прытрымліваюся экалагічнага ладу жыцця. Жыву на ферме, у мяне невялікая гаспадарка: два кані, два каты, два сабакі, дзесяць курыц. Я — жорсткі вегетарыянец. Мой дзень пачынаецца з таго, што я прачынаюся і іду глядзець свой архідарыюм. У мяне вялікая калекцыя архідэй — каля двухсот відаў — і я спецыялізуюся на вырошчванні рэдкіх гатункаў гэтай кветкі, асабліва тых, якія знікаюць, і вяртаю іх у асяродзе, дзе яны мусяць расці. Гэта важны момант — разам са знікненнем кветкі або жывёлы змяняецца і ўвесь сусвет. Што мы пакінем пасля сябе?

Калі я быў малады і толькі пачынаў занурацца ў стрыт-арт, адзін з маіх настаўнікаў сказаў мне: "Перш, чым намаляваць штосьці на сцяне, ты мусіш добра падумаць. Бо потым людзі будуць жыць побач з тваёй выявай". Мае ўніверсітэты даволі разнастайныя: і баўленне часу на вуліцы, і навучанне ў школе выяўленчых мастацтваў, і нават праца з гістарычнай спадчынай. Мне хочацца дадаць колеру ў аблічча вашага горада — гэта, напэўна, самае галоўнае. Колер і ёсць маёй зброяй для змянення свету.

Дыега Дэдабліа працуе каля культурнага цэнтра "Корпус" (Машэрава,9), які прадастаўляе матэрыялы і харчаванне для мастака і валанцёраў.

Паліна Пірагова і Васіль Цімашоў аплятаюць трубамі з лазы будынак на вуліцы Кастрычніцкай, 16.

Дыега Дэдабліа: "Люблю далікатнасць"

На тэрыторыі культурнага цэнтра "Корпус" Дыега і яго каманда толькі зачышчаюць сцяну будынка — праца распачалася зусім нядаўна.

— У маім нататніку мноства скетчаў, — кажа мастак. — Тут я хачу выкарыстаць розныя этнічныя матывы. Галоўнае пано на тарцы будынка змесціць выявы жанчыны і мужчыны — месяца і сонца. Шмат раслінных арнаментаў — я люблю падобныя роспісы — зоркі, анёл… Выявы будуць пераходзіць адна ў адну. Я імкнуся змешваць самыя розныя культуры і лічу, што Сусвет нельга падзяляць на асобныя часткі. Я прыхільнік канцэпцыі Пангеі — першага непадзельнага кантынента, калі людзі жылі разам і ўяўлялі адну сям'ю. Чалавецтва сёння, мне падаецца, мусіць быць такой сям'ёй, і для мяне галоўнае, не якой ты нацыянальнасці, а які ты чалавек. Россып культур — гэта тое багацце, якім усе мы валодаем. Бессэнсоўна ў наш час казаць, што існуе толькі бразільская ці якая іншая культура.

Я пачынаў з коміксаў — капіраваў розныя стылі, каб навучыцца ў невялікім эскізе выяўляць экспрэсію і думку. Гэта вельмі дапамагло мне ў пошуку маёй мастацкай мовы. Таксама шмат вывучаў творчасць бразільскіх аўтараў — Лазара Сегала, Дзакарыя Аўтуоры, хадзіў на заняткі школы мастацтва ў Сан-Паўлу. Гісторыя сусветнага мастацтва, канцэпт кіно таксама для мяне важныя. Паветра, якім я дыхаю, гэта не абмежаваная прастора культуры, а ўсё, што навокал і да чаго мне ўдаецца дацягнуцца.

Я вялікі прыхільнік Карла Густава Юнга. Нельга недаацэньваць той уплыў, які аказвае на псіхіку чалавека колер, выявы, вобразы. Навокал нас — шмат рэкламы, якая імкнецца зачапіць, і чалавек увесь час знаходзіцца ў стане стрэсу або ўзбуджанасці. Я ў сваіх працах хачу даць людзям магчымасць сузіранння, рэфлексіі, тэрапіі. Малюю шмат розных дэталяў, якія трэба доўга разглядаць, выкарыстоўваю колеры, якія супакойваюць, — каб людзі адчувалі сябе камфортна. Я хачу, каб мае малюнкі сталі месцам прыцягнення, гарманізавалі атачэнне. Люблю працаваць у цішыні, каб выпраменьваць падобную энергетыку. Дарэчы, маё жыццё і творчасць літаральна змянілі фільмы Андрэя Таркоўскага.

Магчыма, для кагосьці я даволі дзіўны стрыт-мастак, але… я такі як ёсць. Люблю змешваць: афрыканскія матывы, скандынаўскія, бразільскі спірытызм, шаманскія малюнкі… Люблю псіхалогію, далікатнасць. Кажуць, што такіх стрыт-мастакоў не бывае? Але я ж ёсць!

Паліна Пірагова і Васіль Цімашоў: "Горад паступова мяняецца"

У ангары, дзе працуюць творчы дуэт "Рэха" і іх памочнікі, стаіць духмяны водар лісця. Паліна і Васіль ствараюць аб'екты з лазы — трубы, якія аплятуць заводскі будынак, захапіўшы яго ў своеасаблівы "зялёны" палон. Васіль зварвае металічныя каркасы, якія потым аплятае галінкамі Паліна і К. Працы так многа, што сёлета, па словах мастакоў, удасца зрабіць толькі першыя дзевяць метраў "зялёнай" трубы. Гуляем з Палінай па дыване з лісця — у той час, як валацёры носяць новыя галінкі.

— У выніку нашай працы гарадская прастора напаўняецца прыроднай структурай, — кажа яна. — Адпаведна, змяняецца сэнс формы, канструкцыі і яе прызначэнне. Калі ў нас атрымаецца зрабіць скульптуру цалкам, гэта будзе крона дрэва, якая "падсілкоўвае" горад. Ужо выкарыстаны тры прычэпы лазы. Усяго, напэўна, на выраб трубы пойдзе шэсць. Можаце не хвалявацца, мы ў прыродным асяродку нічога не парушаем. Лаза сячэцца ўздоўж берагоў рэчкі, дарог — і наадварот, потым з адной адсечанай пачынаюць расці некалькі маладых галінак.

Труба "вісіць" ўздоўж сцяны, і пракласці такі няпросты маршрут вымагае вельмі шмат працы. Налета даўжыня канструкцыі мае дасягнуць 20 метраў. Хацелася б, канешне, каб была ўнутраная падсветка — яна адразу зробіць эфект "усмоктвання" трубы ў будынак, энергія пацячэ па трубах, але пра гэта пакуль рана казаць.

Увогуле, працаваць з лазой для нас вялікае задавальненне. Нам блізкія тэмы рэгенерацыі прыроды, энергіі зямлі, святла, мы цалкам падзяляем светапогляд праекта Vulica brazil. Асноўныя нашы матэрыялы і ёсць арганіка: камень, лаза, кара… Але з каменю такія аб'ёмныя скульптуры, як з лазы, цяжка сабе дазволіць.

Мяне ўразілі валанцёры, якія прыйшлі нам дапамагаць. Мы не чакалі, што моладзь з такой адданасцю возьмецца за даволі складаную, хоць і медытатыўную працу пляцення. Увогуле, рух, які адбываецца на фестывалі, перакананўча засведчыў, што маладыя людзі хочуць паляпшаць свой горад, змяняць яго ў лепшы бок. І калі бачыш, як гараць у іх вочы, — разумееш, што з такім імпэтам многага можна дамагчыся.

Мяркую, што Мінск паступова мяняецца. Нядаўна мы з Васілём самі прапаноўвалі свае скульптуры розным інстытуцыям, а сёлета ўжо да нас прапановы сыплюцца, бы з рога дастатку. Батанічны сад, Арт-астравы на Камсамольскім возеры, Freaky Summer Party, Тыдзень дызайну ў Траецкім прадмесці… Вось і Vulica brazil таксама дадае да мураляў аб'ёмныя скульптуры. Усё гэта — сведчанне руху, што адбываецца ў горадзе, і дадатковыя магчымасці мінчанам далучыцца да сучаснага мастацтва. Звычайна сустрэча з ім адбываецца ў нас як? Ладзіцца выстава, на якую прыходзяць пераважна іншыя мастакі паглядзець на працу сваіх калег. Паглядзелі — і разышліся. А калі мастацтва выходзіць на вуліцы, то ўзаемадзеяння з публікай ужо ніяк не абмінуць, — адбываецца дыялог, кантакт, і гэта змяняе асяродак. Адпаведна, і культурны клімат горада становіцца іншым.

У іншых краінах нават гандлёвыя цэнтры імкнуцца прыцягнуць да сябе аўдыторыю, размяшчаючы ў сваіх прасторах сучаснае мастацтва. Мы ж толькі пачынаем фарміраваць попыт на такія творы. Пакуль яшчэ няма аўдыторыі, якая гатова заплаціць за падобны прадукт. Усё развіваецца павольна.

Важная рэч — энергія тых энтузіястаў, якія змяняюць наш асяродак. Збольшага, гэта людзі, якім трошкі болей за трыццаць, а мо нават і маладзейшыя. Але яны ўмеюць дамаўляцца, знаходзіць кропкі судакранання з уладамі, вырашаць праблемы — і робяць праекты, якія змяняюць горад і нас з вамі. Магу толькі захапляцца іх імпэтам і вытрымкай. Гэта здорава, што такія людзі побач з намі. І давайце іх цаніць!

К

Словы пра маэстра Артура Клінава

Працягваючы на старонках "К" сваю серыю "сяброўскіх нарысаў", мастак і літаратар Адам ГЛОБУС піша пра мастака і літаратара Артура Клінава.

Праекты

Артур Клінаў рухаецца ад аднаго праекта да другога. Пачынаў ён з праекта "Карціны". Пісаў адно палатно за другім, пакуль не напісаў карціну, якую не змог прадаць. За праектам "Карціны" пайшоў праект "Інсталяцыі". За праектам "Інсталяцыі" з'явіўся "Часопіс". У праекце "Часопіс" нарадзіўся праект "Раманы". Паралельна з гэтымі праектамі ў Артура ідзе праект "Фота". Дзіўна было б, каб Клінаў не паспрабаваў запусціцца з праектам "Кіно". У Артура шмат праектаў, і, што цікава, большасць з іх паспяховая і прыбытковая. Не толькі ў Беларусі — у Германіі, у Польшчы, у Францыі і ў Расіі.

Апошнім часам Артур шмат займаецца праектам "Лецішча", і нават ён пачаў прыносіць прыбыткі, бо на лецішчы ў Клінава пачалі ладзіцца творчыя сустрэчы, фестывалі і семінары. Мяне заўсёды дзівіла здольнасць Артура своечасова спыняць непрыбытковы праект, у гэтым ягоны талент праяўляецца найбольш яскрава.

Альбомчык

Я з жонкай выходзіў з універсама "Цэнтральны", калі нас пераняў Артур Клінаў з фотаапаратам напагатоў. "Вырашыў сфатаграфаваць усіх найлепшых мастакоў у Беларусі!" — патлумачыў ён свой намер. "Нас будзеш разам фатаграфаваць ці паасобку?" — "Вас? Разам!" Праз які месяц ці два Артур паказаў невялічкі альбомчык, у такія альбомчыкі акуратныя дзяўчаткі збіралі партрэты сваіх сяброўак, віншавальныя паштовачкі з ружамі і вясельныя здымкі знаёмых. У Артура альбомчык быў шчыльна наладаваны тварамі і постацямі сучасных мінскіх мастакоў. Там была Люда Русава, быў Вова Цэслер, былі браты Кашкурэвічы... Пагартаўшы альбом, я сказаў, што Артур назбіраў найлепшых прадстаўнікоў альтэрнатыўнага мастацтва. "Іншага мастацтва і не бывае!" — сказаў тады Клінаў. Пярэчыць я не стаў.

Валянціна Цюленева

Я пазнаёміўся з ёю, калі паспрабаваў набыць першы нумар часопіса Клінава. "Я прадаю часопіс толькі ў харошыя рукі!" — чую ад яе. "Скажыце рэдактару — Артуру Клінаву, што ягоны першы часопіс набыў Адам Глобус!" — "Добра, я так яму і перадам!" Праз тыдзень, на прэзентацыі часопіса, я даведаўся, што распаўсюдніца нашых меркаванняў пра сучаснае мастацтва — маці Артура. Яна была апранута па-святочнаму і выглядала вельмі шчаслівай, яна радавалася за поспех сына. І я павіншаваў яе з поспехам, і мы пераэнаёміліся яшчэ раз.

Потым яе не стала. Яшчэ тыдзень таму, позна ўвечары я бег па вакзальным падземным пераходзе, а яна стаяла з сынавым часопісам і ўсміхалася мне. Я спяшаўся, як і ўсе спяшаюцца, ідучы праз вакзал. Не ведаў, што менавіта такою будзе апошняя сустрэча са спадарыняй Валянцінаю. Каб можна было вярнуцца… Нельга. Свет незваротны.

Бясплотны дух

Авангардыст Артур Клінаў атрымаў развод, у судзе ён скасаваў свой шлюб. Разводзіцца Артур задумаў на ўласным вяселлі, але больш за пятнаццаць гадоў ішоў да рэалізацыі задуманага. Здзейснілася мара: Артур зноўку стаў вольным мужчынам, які шукае роднасную мастакоўскую душу для сумеснага пражывання. Патрабаванняў да душы ў Артура даволі многа. Душа мусіць любіць ці палюбіць наш Мінск — горад сонца, яна абавязана шанаваць сучаснае мастацтва і найноўшую літаратуру, душа павінна разумець авангардыста Артура Клінава. Цікава тое, што сексуальных патрабаванняў Артур не высунуў. Таму душа можа быць у якім заўгодна целе — або нават увогуле без яго.

Шчучынскі харор

Беларусы робяць сто першую спробу зняць сваё кіно. Калі ўлічыць, што ўсе папярэднія праваліліся з ціхім трэскам, здаецца, ніякіх надзей атрымаць добры фільм няма. Таму і здымуць фільм жахаў на Шчучыншчыне. Аўтарам ідэі сцэнарыя запрасілі асобу паважаную і вядомую — Мэрымэ Праспэра. Сюжэт пра чалавекамядзведзя таксама ўсе ведаюць. А вось Шчучын у вялікім свеце мала хто бачыў. Шчучын нават у Беларусі месца не з самых папулярных. Так што шчучынскі харор (па-нашаму — жудасць) мае права на фільмаванне.

Найбольшае ўражанне на рэжысёра Кудзіненку і мастака Клінава зрабіў начны шчучынскі бар.

Такім бачыць Артура Клінава Адам Глобус.

Там сядзелі бландзіны з блакітнымі вачыма і спявалі беларускія песні. "Уяўляеш? Усе бландзіны. Усе з блакітнымі вачыма, і ўсе спяваюць песні па-беларуску!" — тройчы паўтарыў Артур Клінаў. Харор! Шчучынскі харор! Сапраўды, жудасць. Калі каго і баяцца ў свеце, дык гэта бландзіна з блакітнымі вачыма, які ўночы запальвае агонь і пачынае спяваць сваё.

Эталоны мінулага

Чытанне "Шклатары" Клінава прымусіла мяне перачытаць "Шклатару" Алеся Асташонка. Перачытваючы найлепшае апавяданне Асташонка, я падумаў, што літаратура трымаецца менавіта на перачытваннях, а не на простых чытаннях. Калі ў нашай літаратуры ёсць творы не толькі для займальнага прачытання, а назапасіліся тэксты, вартыя шматразовага перачытвання, значыць, беларуская літаратура адчувае сябе нармальна. Скажу шчыра, "Шклатара" Клінава, як і "Шклатара" Асташонка, вельмі далёкія ад маёй любімай шклатары Азенфана і Ле Карбюзье, якія пісалі на палотнах нацюрморты з бутэлькамі і стварылі эталонны стыль — пурызм. У іх карцінах чыстыя і празрыстыя слоікі, шклянкі ды бутэлькі выстройваліся ў геаметрыю ідэальных архітэктурных пабудоў. Менавіта чысціні і выбудаванай саборнасці няма ў "Шклатарах" Асташонка і Клінава. А я чамусьці шукаў у тэкстах менавіта пустату, загорнутую ў празрыстасць, якая ёсць нават у самай звычайнай бутэльцы.

Мутант

Каб надмагільную пліту ўпрыгожваў любімы твор нябожчыка, дык на помніку раманісту Артуру Клінаву (хай Артур пражыве сто дваццаць гадоў!) мусіў бы з'явіцца "Мутант" жывапісца Лёшы Жданава.

Параза

Адны мастакі лёгка перажываюць паразу, другім цяжка даецца пройгрыш. Артур належыць да тых, хто верыць у сваю зорку, верыць ва ўласны талент, не сумняваецца ў якасці сваіх твораў, а таму цяжка пераносіць любы, нават самы дробны пройгрыш. Ну не далі табе прыз, ну не атрымаў ты сабачага медаля ці прэміі — скажы сабе: "Не вельмі я і спадзяваўся на ваш густ, прэміядаўцы!" Скажы паўтара-тры разы і супакойся.

Артур Клінаў так не можа. Ён доўга рыхтуецца да спаборніцтваў. Аддае на барацьбу шмат сілаў. Да змагання на сваім баку набірае шмат рэкрутаў. Таму, атрымаўшы паразу, моцна маркоціцца. Можа некалькі дзён запар злоўжываць. Абурэнні цякуць з Артура, як тая лава з вулканічнага кратара. Напоі і час паціху залізваюць душэўную рану ад паразы. Клінаў супакойваецца і пачынае актыўную падрыхтоўку да новых спаборніцтваў і змаганняў.

Паплечнікі

Артур заўсёды меў шмат паплечнікаў, якім давяраў. Па пытаннях з беларускай мовай ён звяртаўся да Змітра Саўкі. Пра перформансы разважаў з Людай Русавай і Ігарам Кашкурэвічам. Пра колер і жывапіс гутарыў з Сяргеем Кірушчанкам і Ігарам Цішыным. Планы на здымкі кіно выбудоўваў з Андрэем Кудзіненкам. У паэзіі высока ставіў меркаванне Лёшы Жданава. У філасофіі — Валянціна Акудовіча. У літаратуры — Бабкова і Дубаўца. Мастацкі радыкалізм Артур ценіў у паводзінах Віталіка Ражкова і Гены Хацкевіча. Майстэрства, аптымізм і гумар для Клінава найперш нітуюцца з прозвішчамі "Цэслер" і "Вашкевіч". Экспрэсія для яго ўвасабляецца ў творах Уладзіміра Акулава і Валодзі Лапо. Усіх гэтых людзей Артур не толькі любіць і паважае, ён прапагандуе іх творы, друкуе іх кнігі і альбомы, ладзіць іх выставы, робіць ім публікацыі.

Паўторы

Для літаратараў, журналістаў і чытачоў злачынца цікавы толькі ў тым выпадку, калі ён серыйны. Раз — не Фантамас! Адно злачынства можа быць выпадковым, на гэтым будуць настойваць адвакаты і праваабаронцы, а вось з серыямі злачынстваў іншая справа. Серыі больш уражваюць і больш пераконваюць. Таму, пабачыўшы палатно Артура Клінава, якое метафарычна адлюстроўвала тэму смерці, я параіў яму неадкладна напісаць працяг. Артуру не трэба два разы паўтараць разумную прапанову. Ён хапае разумныя прапановы адразу. Таму ў хуткім часе гледачоў радавала "Смерць-2", якая і фарматам была большая і колерамі ярчэйшая.

Серыйнасць у творчасці Артура вельмі важная рэч. Ён любіць паўторы. Ён зрабіў шмат кампазіцый з вёдрамі, з чамаданамі, з выварками, са шпакоўнямі і з катафалкамі. Найбольш вядомай у Клінава атрымалася серыя саламяных рэчаў. Як у свой час Мерэт Апенгейм зрабіла кубачак для кавы з футра, так Артур Клінаў зрабіў тэлевізар з саломы. Саламяны тэлевізар мяне ўразіў, і я прапанаваў Артуру зрабіць саламяную Таемную вячэру. Артур выляпіў з саломы Хрыста і ягоных вучняў. Думаю, што Леанарда, якому ў той час спаўнялася 500 гадоў з дня нараджэння, залатая саламяная беларуская Таемная вячэра таксама парадавала.

Адам ГЛОБУС

Хроніка няспраўджанай катастрофы

Усе мы — у адной лодцы жыцця

У аснову спектакля пакладзены рэальныя падзеі 1961 года на савецкай падлодцы К-19.

Некаторыя тэатры яшчэ толькі закрылі сезон, а Нацыянальны акадэмічны драматычны імя Максіма Горкага ўжо адкрыў новы — юбілейны, 85-ы. Пачаў з прэм'ернага спектакля "Падводнікі". Вы яшчэ не бачылі яго? Абавязкова паглядзіце. Чаму? Растлумачу.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Калі вам скажуць, што "Падводнікі" — сусветны шэдэўр, не верце: сусвет пакуль не меў магчымасці ацаніць ні п'есу, ні пастаноўку. Але гэта той прафесійна выкананы спектакль, які заслугоўвае ўвагі. У ім сышліся актуальнасць праблематыкі і асноўныя патрабаванні глядацкага "райдару" шырокай публікі — за выключэннем хіба праславутай камедыі, хаця жартоўных момантаў ён не пазбаўлены.

Па-першае, спектакль створаны па аднайменнай п'есе вядомага беларускага драматурга Андрэя Курэйчыка. У аснову былі пакладзены рэальныя падзеі 1961 года на савецкай падлодцы К-19. А нарадзілася п'еса з ідэі, што належала мастацкаму кіраўніку тэатра, рэжысёру-пастаноўшчыку спектакля Сяргею Кавальчыку. Іншымі словамі, не драматург беспаспяхова абіваў парогі, а тэатр сам замовіў п'есу, якая яму патрабавалася. Фантастыка? Для некаторых тэатраў, можа, і так. А для гэтага — звычайная практыка. І не толькі для згаданага тандэма аўтара з рэжысёрам (нагадаю, мінулы плён іх супрацоўніцтва — "Пане Каханку" — ідзе на сцэне з 2010-га, збіраючы аншлагі). Акурат такім жа чынам, у выніку замовы драматургу, узнік "Пясняр" Васіля Дранько-Майсюка ў пастаноўцы Валянціны Еранькова, уганараваны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай тэатральнай прэміяй нашай краіны.

Па-другое, "Падводнікаў" трэба глядзець, каб напоўніцу ацаніць той магутны піяр, які атрымала прэм'ера, паказаная напярэдадні Дня Незалежнасці. Андрэй Курэйчык паўстаў як геніяльны піяр-менеджар, прадзюсар, арганізатар. Разгорнутая прэс-канферэнцыя, дзе паралельна закрануліся некаторыя праблемы сучаснай айчыннай драматургіі і яе сцэнічнага ўвасаблення, адбылася ў мультымедыйным прэс-цэнтры Sputnik Беларусь. Ды колькі ўсяго іншага было прыдумана, каб прыцягнуць увагу да падзеі!

Таму адзначым, па-трэцяе, што спектакль сапраўды ўдала спалучае, ужо на ўзроўні ідэі, зварот да нацыянальнай тэмы (герой-беларус, які становіцца выратавальнікам не толькі служачых падлодкі, але і ўсяго сусвету ад ядзернай катастрофы, мінулая чарнобыльская трагедыя, цяперашняе будаўніцтва Беларускай АЭС на Гродзеншчыне) — і агульначалавечую цікавасць да абранай праблематыкі. Бо тут закранаецца цэлы шэраг надзвычай актуальных тэм: тэхнагеннай катастрофы, адказнасці і абавязку, самаахвярнасці, подзвігу. Нарэшце, маральнага выбару.

Яшчэ адну прычыну неабходнасці "культпаходу" на "Падводнікаў" можна акрэсліць проста: гэты спектакль — для вас, жанчыны! Не толькі таму, што ў ім, вядома, узняты і тэмы кахання, здрады, вернасці, спрадвечнага жаночага чакання, што трымаецца на любові і надзеі, а таму, што на сцэне з'яўляецца ледзь не ўвесь мужчынскі склад тэатра і студэнты Акадэміі мастацтваў. У якім яшчэ спектаклі вы ўбачыце столькі прыгожых, статных мужчын і юнакоў? Ды ў ваенна-марской форме, якая робіць іх яшчэ больш падцягнутымі? Ну, а моцнай палове чалавецтва, безумоўна, будзе цікава спалучыць тэатр з ваенным музеем і ў падрабязнасцях разгледзець "начынку" падводнай лодкі не на макеце, а ў рэальных маштабах. Сцэнаграфія Алы Сарокінай, дзе ва ўсю сцэну ўсталяваны два паверхі тэхнікі "ў разрэзе", гэта дазваляе. Тым больш, што ўсё рабілася пры непасрэдным даглядзе спецыялістаў-кансультантаў.

Аматары кіно змогуць параўнаць са спектаклем фільмы, прысвечаныя той жа аварыі на згаданай савецкай падлодцы. Філолагі — паспрачацца наконт залішняй "кніжнасці" некаторых дыялогаў. А вось тэатральным эстэтам, крытыкам, схільным да сімволікі ўласна тэатральнай мовы, спектакль можна абмінуць. Ён зроблены настолькі дэмакратычна, што ўсё гэта там па мінімуме. Адзіным, бадай, прыёмам становіцца тое, што загінуўшыя ад радыяцыі застаюцца назіраць за жывымі — у белых строях, бы агаліўшы свае душы. А смерць, у адпаведнасці са славянскім фальклорам, можа прыйсці ў аблічны Русалкі. Гэтак жа "дазіраваны" ў спектаклі эмоцыі і роздум: гэта не фільм-катастрофа, не блокбастар (хаця ўкладзена ў яго, па тэатральных мерках, грошай нямала), не трылер, не філасофская прытча. Жанр азначаны як "хроніка катастрофы, што не адбылася" — і гэта апраўдвае нетаропкі апавядальны тон. Вам не давядзецца пасля прагляду не спаць усю ноч, вяртаючыся да калізій і пераасэнсоўваючы няпростыя рашэнні герояў: усё гэта вы паспееце зрабіць падчас спектакля.

Зорны склад акцёраў (сярод іх ёсць Руслан Чарнецкі, Вераніка Пляшкевіч, Аляксандр Вергуноў, Іван Мацкевіч, Сяргей Жбанкоў — ды ўсе ўлюбёнцы публікі) дапаўняюць дэбютанты. Сапраўдным адкрыццём рэжысёра стала студэнтка БДАМ Віталіна Бідзюк. Ёй былі даверany адразу дзве супрацьлеглыя ролі: Светы, якая з'яўляецца дачкой галоўнага героя і ад імя якой вядзецца аповед, і Русалкі.

Кампазітарам быў запрошаны Іван Бурляеў — сын Мікалая Бурляева і Наталлі Бандарчук. Што ж, было б няблага, каб спектакль пры магчымасці паехаў у Расію, нягледзячы на груваскае сцэнаграфічнае збудаванне і вялікі склад акцёраў.

К

На оперна-балетным ворыве

8 верасня Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі адкрые юбілейны 85-ы сезон шостай па ліку пастаноўкай на сваёй сцэне "Травіяты". Мінулы ж сезон, нагадаем, завяршаўся сусветнай прэм'ерай балета "Ор і Ора". Самая што ні ёсць папулярная класіка ў прынцыпова новай інтэрпрэтацыі (запрошаны рэжысёр Андрэйс Жагарс з Латвіі перанёс дзеянне оперы Вердзі ў сучасны Парыж) і, у процівагу, пошук цалкам новых найменняў — чым не творчае крэда любога тэатра? Прасочым асаблівасці.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Сучасных опер тэатру пакуль бракуе. Праўда, кіраўніцтва штораз запэўнівае ў сваім жаданні зрушыць, нарэшце, са стылістыкі XIX стагоддзя. Але пакуль гэта выяўляецца хіба ў "актуалізацыі" класікі за кошт згаданага вышэй храналагічнага перамяшчэння оперных падзей.

Што да балета, дык новае найменне з'явілася па ініцыятыве аўтара ідэі і лібрэта, які меў гатовую музыку. Спектакль адразу паставілі. Цуд? Для параўнання прывяду іншы прыклад. У 2015-м тэатр сам звярнуўся да беларускага кампазітара Вячаслава Кузняцова, балет "Вітаўт" якога атрымаў безліч узнагарод, з ідэяй і лібрэта "Анастасіі Слуцкай": тэрмінова патрэбна музыка. Неўзабаве з'явілася партытура. Але абяцаная прэм'ера, пра якую гаварылі ледзь не на кожнай прэс-канферэнцыі, усё неяк адкладвалася, пераносілася. Апошнія звесткі — чакайце"…Слуцкую" ўвесну 2018-га.

Супрацьлеглая сітуацыя з "Орам…" тлумачыцца проста. Прапанова ўвасобіць гэты балет сыходзіла ад Вячаслава Заранкова. Ураджэнец вёскі Хадулы непадалёк ад Оршы, а цяпер знаны мільянер, генеральны дырэктар і старшыня савета дырэктараў групы будаўнічых кампаній Санкт-Пецярбурга, кандыдат тэхнічных і доктар эканамічных навук, вядомы мецэнат і палітык, ён рэалізуе сябе ў мастацкай творчасці: жывапісе, літаратуры. У балетнае лібрэта ён перарабіў сваё апавяданне "Арлы і людзі", надрукаванае ў праграмцы. Музыку па яго просьбе напісаў расійскі аўтар Міхаіл Крылоў. Яна гучала ў канцэртнай версіі, быў выдадзены альбом-двайнік. Нарэшце, узнік балет. Але лібрэта і, адпаведна, музыка змяніліся.

Гісторыю пра арліную вернасць, што стала прыкладам для людзей, балетмайстар Аляксандра Ціхамірава паспрабавала вывесці на абагульнена філасофскі ўзровень. Такое пераасэнсаванне рэальных падзей, апісаных у апавяданні, безумоўна, мела рацыю: сучаснае харэаграфічнае мастацтва імкнецца да філасофскай асацыятыўнасці — нават пры звароце да пакладзеных у яго аснову літаратурных твораў. Але непараднае пластычнае ўвасабленне не пайшло далей збітых ісцін. Атрымалася грымучая сумесь класічных балетных па, сучаснага танца і побытавых дэталяў кшталту газеты і бутэлькі ў руках Мужчыны, каструлі з чарпаком — у руках Жанчыны.

Тая ж сумнеўная эклектыка чулася ў музыцы. Лірычная тэма — эстраднага кшталту. Шэрая "масоўка" — на матыў "Паганага плясу Кашчэева царства" з балета "Жар-птушка" Стравінскага. А яшчэ "Балеро" Равэля — з тым жа працяглым "амаль" цытаваннем, што ніяк не спішаш на постмадэрнісцкія гульні. І колькі ні намагаўся беларускі кампазітар Алег Хадоска неяк "прыправіць" гэту бясконцую музычную кампіляцыю цікавай аркестроўкай, сімфанічным развіццём, поліфанічным правядзеннем тэм — усё марна.

Сцэнаграфія Вячаслава Окунева апелюе да постапакаліпсічных роздумаў, што непасрэдна звязана з новай ідэяй балета — нараджэння любові ў асяродку абязлічаных людзей-коканаў. Але яна — не для гэтай музыкі і ўжо зусім ніяк не да цяперашняй харэаграфіі.

"Ор і Ора" — яшчэ адна гісторыя пра арліную вернасць, што стала прыкладам для людзей.

Затое выканаўцы працавалі на ўсе сто! У гэтым сэнсе назва балета "Ор і Ора", у якой адлюстраваны птушыныя мянушкі, можа лічыцца гульнёй слоў. Бо так і хочацца сказаць: аралі многа. Маючы на ўвазе зусім не сельскагаспадарчы працэс, а перыяд развучвання кожным сваёй партыі — што музычнай, што харэаграфічнай. Аркестр гучыць выразна. Андрэй Іваноў (а гэта першая пастаноўчая праца маладога дырыжора) добра размяркоўвае кульмінацыі, імкнецца да музычнасці фразіроўкі. Артысты балета намагаюцца хоць як ажывіць сваіх даволі хадульных, мёртванароджаных персанажаў. Вока адразу вылучае вытачана-вытанчаную фігурку грацыёзнай Яны Штангей (Ора). Рамантычнай узнёсласцю напоўнены рухі Такатошы Мачыяма (Ор), які часцей танцуе характарныя партыі.

Свае асацыяцыі звязаны і з рускамоўным варыянтам назвы, дзе слова "ор" выступае сінонімам крыку, піяру. Сапраўды, інфармацыйнай падтрымцы прэм'еры можна было пазайздросціць. Шквалу апладысментаў — таксама. У магутнай групе патрымкі, што прыехала з Расіі, былі прадстаўлены розныя слаі грамадства — ад журналістаў да святароў. Будзем спадзявацца, замацуецца і зваротны шлях — нашых артыстаў у Санкт-Пецярбург, хаця б на сцэну Канцэртнай залы "Калізей Арэна" на 700 месцаў, што падначалена Вячаславу Заранкову.

Так што да новага балета трэба ставіцца па-філасофску. Можа, мастацкія якасці не дазваляюць аднесці яго да маленькіх шэдэўраў і нават проста ўдалых спектакляў. Але ў тым, як ён стварaўся, ёсць цудоўная ідэя, што можа дапамагчы ўвасабленню іншых праектаў — і найперш, на маю думку, эксперыментальных, замежных і нацыянальных. Хай вяртаюцца традыцыі Прыватнай оперы Мамантава, пазней — Зіміна ў Маскве. І куды больш глыбокія падмуркі шматлікіх прыватных оперных тэатраў на тэрыторыі Беларусі XVIII стагоддзя, дзе ставіліся, між іншым, не пакрытыя пылам гадоў, а найноўшыя еўрапейскія творы — і, натуральна, беларускія. Спадар Заранкоў пры жаданні мог бы зрабіць для нашага музычна-тэатральнага мастацтва не менш за "Белгазпрамбанк" для драмтэатра і выяўленчага мастацтва. І менавіта праз гэта ўвекавечыць сваё імя. Дык, можа, "Ор і Ора" сталіся прыступкай да гэтай высакароднай місіі?

К

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

У Маладзечне нас чакала дырэктар цэнтралізаванай клубнай сістэмы Ганна Уладыка. Гаварылі не толькі пра пэўную нерэалізаванасць устаноў культуры ў Плябані і Красоўшчыне. Цікавіла нас усё: і ход аптымізацыі, і перспектыва развіцця клубных устаноў, і якасць іх штодзённай дзейнасці, і суадносіны высілкаў гарадскіх работнікаў культуры і сельскіх.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ,
Мінск — Маладзечанскі раён Мінскай вобласці — Смаргонскі і Іўеўскі раёны Гродзеншчыны — Мінск / Фота аўтараў

Пяты па ліку дырэктар СДК у Красным — Таццяна Каляда.

Інтэр'еры СДК аздоблены работамі юных мастакоў.

"Я — чалавек ідэйны!"

Маладзечанскі раён: у вёсцы Краснае малююць, танцуюць і ставяць мюзікл

Каемся, мы рэдка бываем у Маладзечанскім раёне. Вабіць у першую чаргу немалы горад Маладзечна са сваімі сталымі культурнымі традыцыямі. На вуліцы Прытыцкага (пешаходнай) ёсць цудоўная кнігарня з букіністычным аддзелам (наведалі!). Тут у нас сябры (не толькі нашы, але і ўсёй рэдакцыі) — Святлана і Рыгор Сарокі, без якіх немагчыма ўявіць мясцовую культурную сцэну, бурлівасць якой станоўча ўплывае і на развіццё мастацтва ў маштабах усёй краіны. А вось на даследаванні культуры Маладзечанскага раёна іншым разам часу не стае. Так, бываем у Вязынцы, Яхімоўшчыне. Але ж гэта не ўвесь маладзечанскі край. Словам, пасля гэтай паездкі далі сабе слова вывучыць духоўныя цікавосткі Маладзечаншчыны — радзімы Янкі Купалы — больш удумліва ды грунтоўна.

Што такое ЦКС?

Дык вось, сустрэліся з кіраўніком цэнтралізаванай клубнай сістэмы Ганнай Уладыка. Гаспадарка ў яе вялікая — 24 клубныя ўстановы. Кожная мае свае праекты, скіраваныя як на мясцовага спажыўца культуры, так і на прыезджых гасцей.

Абмеркавалі перспектывы развіцця Цэнтра традыцыйнай культуры ў Плябані (пра гэтую ўстанову інфармацыя — у папярэднім артыкуле аўтатура). Даведаліся, што апрача ўжо існуючага праекта з дэманстрацыяй абрадавых дзеяў традыцыйнага земляробчага календара — "Фальклорныя вандроўкі" — там распрацаваны праект "Канфедэратка", прысвечаны паўстанцам 1863 года. Яго прэзентацыя запланавана на 26 сакавіка.

Ганна Іванаўна пагадзілася, што гістарычных цікавостак у Плябані багата — на іх аснове можна распрацоўваць разнастайныя квэст-гульні ды шмат іншага, што цікавіць моладзь. Да таго ж, трэба добраўпарадкаваць тэрыторыю, стварацъ дзіцячыя пляцоўкі. Ужо маецца дамова з Красненскім лясгасам, які пагадзіўся дапамагчы ў якасці спонсара.

Ганна Уладыка — "уладыка" ЦКС.

Алена Раманенка: "Ці ж можна не выпісваць "Культуру"?

У час кожнага нашага аўтатура звяртаем пільную ўвагу на прыдарожную рэкламу. Як цяпер без яе? У Плябані яе не заўважылі. Але, як адзначыла кіраўнік ЦКС, у перспектывах ёсць план побач з трасай паставіць банер. Пакуль жа Цэнтр традыцыйнай культуры і побыту "раскручваецца" па-традыцыйнаму: інфармацыя пра яго даецца на мясцовым тэлеканале бягучым радком, на ўласных дошках аб'яў у райцэнтры, на флаерах, што раздаюцца на раённых святах. Праца па прыцягненні турыстаў вядзецца з турфірмамі, школамі, прадпрыемствамі раёна.

Цікавым аб'ектам у сферы рэгіянальнай культуры з'яўляецца і Цэнтр культуры і побыту ў Гарадку. Там, як і ў Плябані, некалькі гадоў таму яшчэ дзейнічаў філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Паселішча каларытнае — толькі адны старадаўнія млыны чаго вартыя! Але чаму ў назве цэнтру няма слоў "традыцыйнай" ці "беларускай"? Патлумачым. Колішняе мястэчка яшчэ гадоў сто таму было, кажучы па-сучаснаму, мультыкультурным. У Гарадку, апрача беларусаў, жыло багата палякаў і яўрэеў. Вядома, да Вялікай Айчынай вайны.

Два гады таму ў рамках форуму "Гарадок і яго яўрэйская гісторыя: мінулае і сучаснасць" адбылося адкрыццё Каменя памяці на былой тэрыторыі гета, у якім загінула больш за 700 яўрэяў мястэчка. Побач была закладзена алея смутку. Дзякуючы мясцовым жыхарам, органам раённай і мясцовай улады пры падтрымцы суполкі "Сябры Гарадка" на карце Беларусі і Еўропы з'явілася яшчэ адно мемарыяльнае месца смутку і памяці ахвяр Халакосту. Летась была ўсталявана дошка з выявай гістарычных славутасцей Гарадка. Яўрэі, што прыязджаюць на гэты форум, прывозяць розныя артэфакты. Да прыкладу, Святлана Марголіна перадала будучаму Гарадоцкаму музею яўрэйскай культуры медны таз, якім карысталіся яе сваякі ў мястэчку Гарадок. Таз гэты пабачыў паўсвету і вярнуўся на радзіму.

Цеснае супрацоўніцтва адносна Гарадка ў ЦКС і з пасольствам Германіі ў Беларусі, а таксама з Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтрам імя Іаханэса Рау — кожны Міжнародны форум адбываецца як знак прымярэння народаў. Праект, трэба сказаць, не абмяжоўваецца толькі яўрэйскай спадчынай. Сёлета ў яго рамках была прадстаўлена беларуская, польская і ўкраінская культуры.

Капэла: вясковая ці гарадская?

Рыхтуючыся да паездкі па Маладзечаншчыне, вырашылі пашукаць цікавосткі. Не толькі помнікі архітэктуры, але і творчыя аб'яднанні. Адно з іх — харавая капэла аграгарадка Лебедзева. Далёка не ў кожнай вёсцы сустрэнеш такое! А тым больш капэлу з гісторыяй. Яшчэ ў канцы XIX стагоддзя ў гэтым мястэчку дзейнічаў царкоўны хор, які падчас святаў выконваў народныя беларускія песні. У 1937 годзе калектыў пачаў звацца капэлай, пасля вайны атрымаў званне "народнай капэлы", а яго канцэрты з поспехам праходзілі не толькі ў гарадах нашай краіны, але і ў Вільнюсе, Маскве, Санкт-Пецярбургу.

Не пазнаёміцца з такім калектывам было б недаравальна. На жаль, на час нашага візіту ён быў у адпачынку. Больш за тое, змяніў прапіску. Каб не згубіць праект, было вырашана ўладкаваць капэлу на базе Дома культуры ў Маладзечне. Склад нядаўна істотна абнавіўся. Прыйшло шмат таленавітай моладзі, якая дэманструе прафесійны ўзровень. А вось з Лебедзева выканаўцаў засталося няшмат. Ранейшыя ўдзельнікі капэлы перайшлі ў мясцовую царкву — спяваюць на кліросе. Усё вярнулася на свае колы.

Шляхам на Залессе

Што агульнага ў Язэпа Драздовіча і Міхала Клеафаса Агінскага? Не, размова не пра творчасць ці светапогляд выдатных беларусаў. Проста, за імя першага канкурыруюць два раёны — Глыбоцкі і

Шаркаўшчынскі. Гэтаксама як і за імя другога — Маладзечанскі і Смаргонскі. Яно і не дзіўна: Маладзечна некалі было ва ўласнасці роду Агінскіх, а ў Смаргонскім раёне ёсць шыкоўная сядзіба славутага кампазітара.

Ганна Іванаўна распавяла, што раёны ўсё ж не столькі канкурыруюць, колькі супрацоўнічаюць. Як прыклад таму — у Залессе неаднаразова выязджалі музычныя калектывы з Маладзечна.

Працуе харэаграфічная студыя. У будучым мюзікле танцорам таксама адводзяцца вядучыя ролі.

"Ідэйныя" чытачы. За дзень у мясцовай бібліятэцы бывае па 20 і больш наведвальнікаў.

Але турыстычнае месца, так ці іначай звязанае са славутым кампазітарам, маецца і на Маладзечаншчыне. Летась добраўпарадкавана тэрыторыя вакол былой сядзібы сакратара Міхала Клеафаса Агінскага Леанарда Ходзькі ў колішняй вёсцы Аборак (сёння — аграгарадок Палачаны). Валанцёры прывялі да ладу месцы, звязаныя з памяццю пра Леанарда Ходзьку: пляцоўку, дзе некалі стаяў касцёл, у якім быў ахрышчаны Ходзька, спачывальню Дэдэркаў — сваякоў Леанарда па матчынай лініі. На месцы бацькоўскага дому Леанарда ўстаноўлены памятны камень з мемарыяльнай шыльдай.

Клубу — 50 гадоў

Трапілася нам па дарозе (абсалютна выпадкова!) вёсачка **Краснае**. Трапілася — і абрадавала. Тутэйшыя людцы кажуць, што ў касцёле Унебаўзняцця Найсвяцейшай Панны Марыі — 33 прыступкі (па колькасці гадоў, што пражыў Хрыстос). Лесвіца ад зямлі да веры. Мы не падлічвалі, колькі прыступак у сельскім доме культуры, але пераканаліся, што гэта — таксама храм. Па той простай прычыне, што скрозь клубную прастору пралягае шлях да нацыянальнай духоўнасці, а людзей тут столькі, што не пратаўкнуцца (нават на клубных прыступках дзяўчына кніжку чытала, а вось сфатаграфавацца пасаромелася). Нам патлумачылі, што традыцыя такая, а клубу неўзабаве — 50 гадоў. Нямала. Значыць, і традыцыя — трывалая.

Пятая па ліку

А вось кіраўнік клуба — маладая. Таццяна Каляда тут — пятая па ліку дырэктарка. У культуры яна — 11 гадоў, тры апошнія — на цяперашняй пасадзе. Мясцовая, скончыла педуніверсітэт, а завочна — універсітэт культуры. У вёсцы — паўтары тысячы насельніцтва. У клубнай самадзейнасці занята 300 чалавек. Установа вялікая, таму ў штаце — сем чалавек. Тут нават харэограф ёсць! І студыя танцаў карыстаецца вялікай папулярнасцю, як, зрэшты, і народная студыя выяўленчага мастацтва. Да слова, клубныя калідоры (нават лесвічныя пралёты) годна аздоблены работамі юных мастакоў. Ёсць проста выключныя жывапісныя ды графічныя аркушы і выцінанкі. Мы такіх галерэй нідзе больш не бачылі. У захапленні круцілі галовамі, а жвавая малеча, блытаючыся пад нашымі нагамі, давала бясконцыя каментары.

За гады камандзіровак мы бачылі дзясяткі бязлюдных, а таму надзвычай сумных клубаў. Гэты ж — жывы і пазітыўны, а таму вельмі прывабны. Клуба кіраўніка ўстановы культуры прыходзіць поспех. *"Толькі тады, калі яму падабаецца ягоная справа!" — зазначыла Таццяна. Вельмі простае тлумачэнне. Хтосьці злёту яго зразумее, хтосьці зло пасмяецца, маўляў, ці варта за капейкі ў такія гулькі гуляцца... Таццяна першая ў раёне звярнула ўвагу на жанчын, якім больш за пяцьдзесят, вырашыла вылучыць іх з грамады, ушанаваць за тое, што робяць яны на працы і ў сям'і. Пасля аднаго з конкурсаў на званне "Супер-мамы" мужчыны пачалі інакш глядзець на сваіх жонак, нават сваркі ў сем'ях, кажуць, зменшыліся. Вось вам і гулькі. На клубных сцягах у Красным напісана "Смерць руціне! Мір — крэатыву!"*

Экскурсія па Красным

Танцавальная студыя таксама працавала! І тут таксама было шматлюдна. У чым перавагі нашага аўтатура? У тым, што самі не ведаем, дзе канкрэтна, у якім населеным пункце, мы прыпынімся. І пра нашы намеры ў Красным не ведалі. Так што нечаканая "населенасць" СДК — не паказушная (хоць і такое ў нашай журналісцкай практыцы раз-пораз здараецца), а будзённая.

Свая клубная эмблема.

Цудоўна ведаем, у якім дэфіцыце на сяле харэографы. Таму і запыталіся ў Аліны Мішурко, ці надоўга яна затрымаецца ў Красным. Яна адказала: "Назаўжды, бо я — ідэйная!" Даўно мы такой "жалезнай" аргументацыі не чулі. А Аліна тым часам прымушала дзяцей (у студыі займаюцца ад трох гадоў да шаснаццаці) здымаць абутак у калідоры, выстройвала іх у харэаграфічнай зале і ўключала музыку. Дзеці ахвотна слухаліся. У ідэйных выхавальнікаў і выхаванцы ідэйныя.

За якую ж ідэю змагаюцца работнікі культуры Краснага? Насычанага і адухоўленага жыцця. Да прыкладу, Таццяна Каляда выношвае праект рэгулярнай, усебакова арганізаванай экскурсіі па вёсцы. Маршруты ўжо распрацаваны. Справа ў тым, што ў Красным існуе каля дваццаці помнікаў, звязаных з гісторыяй паселішча. Апрача згаданага касцёла з арганам ёсць царква Покрыва Прасвятой Багародзіцы, гарадзішча, каталіцкія ды яўрэйскія могілкі. Жаданне — ухвальнае. Мо мы дажывём да тых часін, калі на прэм'еры сельскіх мюзіклаў будуць прыязджаць аматары сцэнічнага мастацтва з абласных цэнтраў ды сталіцы, а ў дадатак захочуць стаць яшчэ і экскурсантамі? А пакуль з тым, пра што марылі і дзеля чаго жылі продкі, не пашкодзіць пазнаёміцца і мясцовай дзятве, а, мабыць, і больш дарослым вяскоўцам.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Колькі ўжо разоў у час нашых аўтападарожжаў задаваўся пытаннем, ці можна з сельскай культуры зрабіць трывалы кідкі брэнд? Не, я не пра "Бяседу" ці "Харошкі". А пра сапраўдную аўтэнтычную. І пакуль я так развважаў, у Красным той брэнд ужо зрабілі, ці, больш дакладна, пачалі рабіць: распрацавалі фірмовы адметны лагатып, які сімвалізуе разнастайныя напрамкі дзейнасці СДК. Чым не прыклад для пераймання?

Рэкордны дзень?

У планах — і стварэнне мюзікла сіламі тэатральнай студыі. Таццяна Каляда — рэжысёр па адукацыі, даўно марыць пра сінтэтычную тэатральную пастаноўку, і цалкам верагодна, што здзейсніць яе на мясцовым матэрыяле. У сувязі з гэтым не магла кіраўнік установы і самую балючую праблему не агучыць. Якасць мерапрыемстваў залежыць і ад іх тэхнічнага забеспячэння. Якраз тут не ўсё як мае быць: адзін ноўтбук на дваццаць клубных фарміраванняў. Вось такія справы. Яшчэ гадоў пяць таму камп'ютары былі толькі ў бібліятэках (і далёка не ва ўсіх), а цяпер паўнацэннаму клубу і аднаго — мала. Шкада, што клубнае тэхнічнае пераўзбраенне за часам хранічна не паспявае. Да слова, і ў многіх бібліятэках камп'ютары паспелі маральна састарэць.

Мы зазірнулі ў сельскую бібліятэку Краснага і зразумелі, што бібліятэкар Алена Раманенка — таксама ідэйная. Мы хвалім тых спецыялістаў, да якіх на момант нашага прыезду завіталі два-тры чытачы. А ў Алены Віктараўны мы налічылі за стэлажамі і ля бібліятэчнай кафедры з дзясятак аматараў кніг самага рознага ўзросту. Не усе, праўда, захацелі фатаграфавацца. На наша пытанне "Сёння рэкордны дзень па наведваннях?" бібліятэкар адказала: "Ды не, самы звычайны". Між тым, яшчэ і абедзеннага часу не было, а ў бібліятэку ўжо завіталі 14 чалавек.

За адзінае баліць галава ў Алены Раманенка — мала кніжных паступленняў. Каб не пастаянныя і бясплатныя перадачы кніг ад жыхароў Краснага, дык зусім кепска было з абнаўленнем фондаў. Хвароба — ці не агульная для ўсіх бібліятэчных устаноў краіны. А лекі і па сёння — не надта эфектыўныя.

Агульнае (не)лірычнае заканчэнне

Маладзечанскі рэгіён — вельмі нестандартны і цікавы на праявы творчай ініцыятыўнасці. Мы разумеем, што кіраўніцтву мясцовай культуры няпроста сумяшчаць гарадскі клопат з сельскім. Аднак пра яўны дысбаланс гаворка не вядзецца. Вёска маладзечанскага краю жыве тымі ж праблемамі, што існуюць ці не ў кожным нашым раёне. Але нам вельмі спадабалася, як вырашаюцца гэтыя праблемы ў Красным, дзе так шмат "ідэйных" работнікаў культуры.

К

Ад яблыка да памідора

Лета — на фінішы, але творчае напружанне ў рэгіёнах не спадае. І справа не толькі ў дажынках, якія немагчыма ўявіць без удзелу клубных ды бібліятэчных работнікаў. У "рэпертуары" аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі хапае іншых мерапрыемстваў, што вызначаюцца якасцю ды арыгінальнасцю. Узяць да прыкладу, "Яблычны Спас" у Алашках. Гэтае абласное свята на Шаркаўшчыне даўно стала брэндавым. І ладзіцца яно ў вёсцы, дзе жыў і працаваў садавод Іван Сікора, які вывеў 500 гатункаў яблыкаў, сто — ігруш, займаўся вырошчваннем сліў, бэзу, ружаў. У Алашках ёсць музей садавода і сядзіба, якую ён узвёў сваімі рукамі. Побач — помнік яблыку (ёсць такі і ў райцэнтры, і на павароце да Алашак), сцэна. Падчас свята быў канцэрт, працавала кавярня, можна было купіць сувенір, пачаставацца яблыкамі. Словам, мерапрыемства атрымалася і якасным, і арыгінальным. Ушаноўваўся не толькі яблык, але і знакаміты селекцыянер. Падвойны брэнд для вёскі і раёна. Дадам толькі, што ў Алашках можна прыдбаць і саджанцы ўнікальных яблынь. Калі пра гэта даведаюцца ўсе зацікаўленыя, у тым ліку і інвестары, свята можа стаць рэспубліканскім.

Яўген РАГІН

Працягваецца рэспубліканская акцыя "**Бабруйск** — культурная сталіца Беларусі". Аддзел бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Максіма Горкага распавядае, што ЦБС у тэатры драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча прэзентавала экспазіцыю "Горад будуецца — горад жыве". У першай яе частцы была падабрана літаратура па гісторыі паселішча і Бабруйскай крэпасці. У другой частцы гаворка ішла пра сучаснасць. Рэкламавалася дзейнасць цэнтра прафарыентацыі "Выбар" пры гарадской бібліятэцы № 8 імя Ефрасінні Полацкай. Паміж цэнтрам і дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжам наладжаны вельмі шчыльныя творчыя стасункі. Імправізаваная літаратурная кавярня прапаноўвала мастацкую літаратуру, дзе героі кніг — прадстаўнікі будаўнічых прафесій. Такім чынам бабруйскія бібліятэкары не толькі прэзентавалі багаты фонд, але і паказалі працу гарадскіх устаноў праз аматарскія аб'яднанні.

Шлях у Польшчу стаў звыклым для народнага ансамбля народнай музыкі "Лірнікі" **Гарадзішчанскай** дзіцячай школы мастацтваў, што ў **Баранавіцкім** раёне. Калектыў браў удзел у XII Міжнародным фестывалі фальклору "Падляшскія сустрэчы" ў польскім горадзе Бранску. Тут сабраліся гурты з Румыніі, Турцыі, Латвіі, Польшчы — каля трохсот чалавек. "Лірнікі" далі дзевяць канцэртаў у сямі гарадах і мястэчках Падляшскага ваяводства і былі ўшанаваны за свой высокі прафесійны ўзровень.

Загадчык аддзела па абслугоўванні дзіцячага чытача **Навагрудскай** раённай бібліятэкі Вольга Фядотава распавядае пра бібліяноч, што прайшла ў яе ўстанове і называлася "Літаратурныя мУРАшкі". *"Мерапрыемства стала адным са складнікаў абласной акцыі "Кніга дорыць свята"*, — піша аўтар. — *Для чытачоў мы арганізавалі тэматычныя пляцоўкі з пазнавальнымі гульнямі, конкурсамі на веданне гісторыі нашага кнігадрукавання, майстар-класамі па маляванні літар старажытнага алфавіту. Былі і "страшныя" гісторыі. Да прыкладу, дзеці, патрапіўшы ў "Грабніцу фараона", маглі пазнаёміцца з муміяй".*

Галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі **Лельчыцкага** райвыканкама Галіна Лісіцкая анансуе VI рэгіянальны фестываль песеннага мастацтва "Гэты дзіўны спеў з глыбінь народных". Ён мае адбыцца 2 верасня на прыз мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага народнага хора Рэспублікі Беларусь Генадзя Цітовіча і ўраджэнца раёна, народнага артыста Беларусі Міхася Дрынеўскага. *"Фестываль ладзіцца з 2004 года*, — піша аўтар, — *Гэтым разам у ім прымуць удзел дзевяць раёнаў Гомельшчыны, а таксама калектывы з Брэсцкай вобласці. Узначальвае журы Міхась Дрынеўскі. Выступіць і Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Генадзя Цітовіча"*. А 3 верасня, распавядае Галіна Лісіцкая, адбудзецца свята горада. Плануюцца выстаўкі-продажы вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, майстар-класы прыпевак і гарманістаў, канцэрты мастацкай самадзейнасці.

Незвычайнае апетытнае свята "Вясковы сыравар" сабрала жыхароў і гасцей аграгарадка **Жупраны**, што на **Ашмяншчыне**. Можна было пакаштаваць і прыдбаць некалькі гатункаў сыроў, сырнікаў, выпечкі на аснове хатніх малочных прадуктаў. А побач з гандлёвымі радамі працавалі выставы народных майстроў. Павышаным попытам карыстаўся гліняны посуд. А дзе яшчэ трымаць малако?! Работнікі культуры прапанавалі вялікую забаўляльную праграму, дзе хітамі сталі конкурсы на хуткасць паядання сыроў і дойкі кароў. Выступілі народны ансамбль песні і танца "Крыніцы", сямейны гурт "Граўжанцы".

Ашмяншчына сёння б'е ўсе рэкорды крэатыву. У раённым цэнтры прайшоў фэст маладзёжнай субкультуры "Мы разам", стаўшы падзеяй сярод аматараў хіп-хопу, року і брэйку. Адной з яскравых частак мерапрыемства стала і свята фарбаў Холі. Аквагрым і часовае тату, эматычныя фотазоны і кірмаш тавараў hand-made зрабілі акцыю непаўторнай. А фантаны фарбаў дадалі святу дзіцячай бесклапотнасці.

У **Воранаўскай** раённай бібліятэцы распачаўся Тыдзень культуры "Суквецце талентаў Воранаўскага краю". Пра гэта напісала метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу згаданай установы Людміла Фурман. "К" пісала пра тое, што пераможцам рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" ў намінацыі "За падтрымку і развіццё чытання" стала **Пагародзенская сельская** бібліятэка (загадчык Алена Вітукевіч). Установа прапанавала шэраг цікавых выстаў. А Воранаўская дзіцячая бібліятэка запрасіла да сябе ў госці выхаванцаў дзіцячых садкоў.

Моталь: лялькі і прысмакі.

Гарадзішчанскія "Лірнікі" ў Польшчы.

На Аўгустоўскім канале кожны — капітан.

Тыдзень культуры на Воранаўшчыне.

Ганцавічы: "Свае" і танчаць, і спяваюць.

Летні "рэпертуар" парадаваў. Якім будзе восеньскі?

Аграгарадок **Цырын** (**Карэліцкі** раён) упершыню ладзіў Мядовы фэст. Усё было вельмі сур'ёзна. Дзея пачалася з прэс-канферэнцыі "Уся праўда пра мёд". Прадстаўнікі лабараторыі пчалярства, што, аказваецца, дзейнічае пры НАН Беларусі, распавялі пра ўнікальныя ўласцівасці салодкай прадукцыі. А потым супрацоўнікі Цырынскага дома культуры запрасілі ўсіх на стадыён. Былі наладжаны канцэрт і кніжная выстава. Працавалі пляцоўкі "Кніжны рой", "Фота-вулей". Кулінары здзіўлялі вырабамі і напоямі з мёду. Пра гэта паведаміла загадчык аддзела метадычнай работы Карэліцкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Аксана Басюк.

Распавядае галоўны бібліятэкар па арганізацыйна-маркетынгавай дзейнасці **Гродзенскага** раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Людміла Трубчык: *"Супрацоўнікі* **Свіслацкай** *і* **Квасоўскай** *сельскіх бібліятэк арганізавалі для дзяцей аграгарадка Свіслач бібліятэчны бульвар. Тут размясціліся дзевяць інтэлектуальна-забаўляльных пляцовак… А на* **Аўгустоўскім** *канале прайшло Свята мора. У бібліятэкараў раёна была свая літаратурная "бухта" з веламібліятэкай!"*

Праект "Бібліятэчны сэрвіс — для аграсэрвіса" рэалізоўваюць супрацоўнікі **Бярэзінскай** раённай бібліятэкі. Пра гэта паведамляе загадчык аддзела маркетынгу згаданай установы Тамара Круталевіч. Праект скіраваны на ўдзельнікаў жніва. Паходная бібліятэчка вандруе па мехдварах і палетках.

У міжнародным фестывалі фальклору "**Мотальскія** прысмакі" (**Іванаўскі** раён) прынялі ўдзел і лялькі Беларускага гульнёвага тэатра роставых лялек з **Дзятлава**.

Свята народнай творчасці "Свае" (ацаніце назву!) адбылося ў **Ганцавіцкім** доме рамёстваў. Такім чынам установа адзначыла сваё 20-годдзе.

Яшчэ адзін анонс. 9 верасня ля гарадскога возера **Іўя** плануецца зладзіць Свята памідора. Ініцыятар — аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Іўеўскага райвыканкама.

К

Галоўны хіт "Ад парога" (з шыкоўнай гітарай Андрэя Дзяменцьева) гурта "Калі юга", у якім выступаў мой суразмоўца, некалі гучаў калі і не з кожнага праса, то на ўсіх радыёстанцыях краіны. Пазней мы, шараговыя тэлегледачы, атрымлівалі асалоду ад саўнда канцэртаў і перадач, які ён рабіў. А цяпер што? Ды нічога асаблівага: Юрый Гарачка тэстуе праграмнае забеспячэнне самай крутой хакейнай лігі свету — НХЛ. І як жа ён дакаціўся да жыцця такога? Паспрабуем разабрацца.

Алег КЛІМАЎ / Фота аўтара

Юрый ГАРАЧКА, 45 гадоў. Нарадзіўся ў Мінску. У 1994 годзе скончыў хімічны факультэт БДУ. З 1992-га па 2004-ы фронтмэн гурта "Калі юга". З 2004-га па 2015-ы гукарэжысёр Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь.

Сорак пяць, палёт нармальны

Былы рокер, былы тэлевізійшчык, а сёння просты IT-спецыяліст Юрый Гарачка

Гукарэжысёр

— Я ішоў на інтэрв'ю з вядучым гукарэжысёрам нашага тэлебачання, а аказалася, што ты на ім ужо не працуеш.

— За камплімент — дзякуй. Аднак я не такога высокага меркавання пра сябе. З тэлебачання ў 2015 годзе звольніўся, бо не прайшоў медкамісію, і кантракт са мной не працягнулі. Я адчуваў, што ў мяне пагаршаецца слых, ведаў, што ў маёй прафесіі гэта звычайная з'ява і верны шлях выбыць з яе, але, вядома, спадзяваўся на лепшы зыход. Хаця "прэтэнзіі" да мяне ў гэтым сэнсе былі і раней. Прапаноўвалі застацца на тэлебачанні ў іншай якасці, я доўга думаў — і ўсё ж тэлек пакінуў. Да мяне, дарэчы, цяпер часам звяртаюцца музыканты, каб я дапамог ім як гукарэжысёр, — не адмаўляю.

— Што глядач слухаў тваімі вушамі?

— Канцэрты, што здымаліся перасоўнай тэлевізійнай станцыяй (сольнікі гуртоў "Сплін", "Наўтылус Пампіліус", іншых замежных артыстаў, фестываль "Славянскі базар у Віцебску", буйныя святы, мерапрыемствы ў канцэртных залах, філармоніі і да таго падобнае), праграмы "Спявай, душа", "Жывы гук", "Музычны плэйоф", "Легенды. Live" (для АНТ)... Усяго і не ўспомніш: усё-такі тэлебачанню аддадзена больш за дзесяць гадоў.

— А як ты трапіў у Белтэлерадыёкампанію?

— У 2000-м годзе ў яе студыі гурт "Калі юга" працаваў над альбомам "Нуль паводле Кельвіна". Зводзіў яго мой будучы начальнік на тэлебачанні Валерый Грэбенка (ён і дагэтуль займае пасаду загадчыка аддзела гукарэжысёрскай студыі галоўнай дырэкцыі тэлевытворчасці Белтэлерадыёкампаніі), а я яму, седзячы на канапе, нешта актыўна падказваў. У нейкі момант ён да мяне павярнуўся з-за пульта і спытаў: "Можа, ты хочаш тут працаваць?" Я ў адказ: "Жартуеце?" Валерый Сцяпанавіч: "Не. Ты — музыкант, астатняму навучышся". Праз два тыдні я, страціўшы ў заробку ў тры разы, звольніўся з прыватнай фірмы, якая займалася вырабам мэблі, і прыйшоў на тэлебачанне. Пачынаў як асістэнт гукарэжысёра, а ў 2004-м ужо сам стаў "руліць".

— Удакладню. З тэлебачаннем ты развітаўся назаўжды?

— Ніколі не кажы "назаўжды", але — так. Можа, толькі пагаджуся на нешта па дамове.

— Тады "сячы" пра яго ўсю праўду! Напрыклад, мне знаёмыя "гукачы" казалі, што тэлевізійны саўнд іх перыядычна проста "забівае"...

— Ці ведаюць яны пра тое, якая гэта праца — "выцягнуць" выканаўца, які спявае так сабе? Тут як ні спрабуй, а яго вакальныя "вушакі" ўсё роўна палезуць у эфір. Або гурт, што грае сярэдненька. І з ім гісторыя тая ж самая. Ты чакаеш самакрытыкі ад мяне, ці што? Так, не заўсёды ўсё атрымлівалася, як хацелася б. Але, зноў-такі, я магу прывесці табе з дзясятак прычын, чаму гук бывае нейкім не тым. З-за залы, скажам, дзе шмат гукавых адлюстраванняў, з няважнай акустыкай, ці з-за налады сцэнічнай апаратуры.

— Прыемна стасавацца з самакрытычным чалавекам. Ну а "секчы" будзеш ці не?

— А я тэлевізар вельмі мала глядзеў і гляджу. Часам толькі "свае" праграмы — з-за чыста прафесійнага інтарэсу. Цябе ж музычны кантэнт цікавіць? Па-мойму, з ім усё нармальна, ва ўсялякім выпадку, у параўнанні з 2000-мі гадамі.

— Ага, заваліся сёння спецыялізаваных перадач пра сучасную беларускую музыку.

— Пагаджуся, ёсць прабел. Але, дапусцім, на "Беларусь 3" шмат праектаў, канцэртаў з аўтэнтычнай музыкай. Я табе са сваёй званіцы скажу: калі браць тэхналогію працэсу, працу з гукам, сітуацыя моцна палепшылася.

— Тады чаму, калі з тэхналогіяй працэсу ўсё добра, большасць тэлевізійных канцэртаў грунтуецца на "мінусовых" і "плюсавых" фанаграмах?

— Таму што тэлебачанню з імі прасцей працаваць. Ды і гукарэжысёраў, здольных вельмі якасна запісваць "жыўцом", у нашай краіне не шмат.

Рок-музыкант

— З былымі калегамі па гурце "Калі юга" ці маеш зносіны?

— Рэдка і выпадкова. Не так даўно нашага гітарыста Андрэя Дзяменцьева на вуліцы сустрэў. Шнар у яго нейкі ў раёне скроні.

— Калі чалавек хоча гарантавана атрымаць прыгоды на сваю галаву, яму варта правесці вясёлы вечар у кампаніі з Андрэем.

— Падпісваюся пад тваімі словамі.

— "Калі юга" нарадзілася як акустычны дуэт?

— Якраз з дуэта з Андрэем. Дзяменцьеў мяне і пацягнуў у бок электрычнага гучання. Было дзіка цікава спрабаваць сябе ў ім.

— Даспрабаваліся да таго, што вельмі хутка сталі адным з лепшых айчынных рускамоўных рок-гуртоў. І раптам...

— Чаму мы развяліся? Мы распаліся тады, калі пачаў стагніраваць рок-клубны рух. Змяншалася колькасць клубаў, арыентаваных на аўтарскую рок-музыку, ім на змену спяшаліся ўстановы, у якіх граўся кавер-рок. А каверы карысныя хіба як прыступка ў самаразвіцці музыканта, і наступным этапам павінна быць самастойная творчасць, калі людзі думаюць аб уласным музычным абліччы. Аказалася, што мала хто думае, і чарговая прыступка для такіх — ізноў каверы. Пераважная колькасць маладых беларускіх рокераў цяпер проста зарабляюць грошы, выконваючы чужы рэпертуар. Я ім у чымсьці нават зайздрошчу, бо з намі часцяком расплачваліся півам. Але не зайздрошчу ў плане самаўдасканалення. Увогуле, гурт не ўпісваўся ў кан'юнктуру. Півам сем'і не пракорміш, а здраджваць сабе мы не хацелі.

Нам, дарэчы, дзесьці ў той час у Піцеры прапанавалі новы фармат каманды: маўляў, калі "Калі юга" зайграе гэтак і гэтак, ёй зоймуцца, пачнуць раскручваць. Адпаведна, прапанавалі іншы варыянт "здрады". Адмовіліся. Тады наогул назапасілася нейкая стомленасць ад музыкі. Нічога не хацелася, прабіваць сцены галавой ужо дакладна. Можа, далі слабіну, трэба было неяк ператрываць? Спробы рэанімаваць склад прадпрымаліся, але асабіста ў мяне ўнутры ўжо ўсё перагарэла. Новыя песні не складаліся, новыя ідэі з сябе мы выціснуць не змаглі. Напэўна, у тым, што адбылося, у першую чаргу віна мая: каб я змог перабудавацца, перасіліць сябе, то хлопцы, хутчэй за ўсё, пайшлі б за мной. Але здарылася тое, што здарылася. Мне Дзяменцьеў неяк выдаў такую характарыстыку (я Цяля па гараскопе): "Ты не Цяля, а цюлень". Я з Андрэем згодны.

— Зусім-зусім нічога з рыфмаў на розум не прыходзіць?

— Асобныя радкі, якія ў вершы, тэксты не ператвараюцца. І радкі гэтыя я нідзе не фіксую. Прыйшлі, сышлі, забыўся, адрэзана.

Астрафатограф і айтышнік

— У цябе незвычайнае хобі...

— Так, астрафатаграфія. Захапленне астраноміяй з'явілася ў маім жыцці раней за музыку. Класе ў сёмым я нават лётаў на Каўказ на злёт юных астраномаў-касманаўтаў СССР! Але паралельна ў мяне добра ў школе ішла і хімія (перамагаў на рэспубліканскай алімпіядзе па гэтым прадмеце, удзельнічаў у дзвюх усесаюзных), таму я, у рэшце рэшт, вырашыў паступаць у БДУ на адпаведны факультэт (астрафізічнага там не было). А пасля распаду "Калі югі" зноў заняўся астраноміяй, але ўжо на новым вітку. У нашай камандзе — Astronominsk — тры чалавекі. Фатаграфуем неба, целы, што засяляюць яго. Нашы фота публікаваліся ў прыгожых глянцавых амерыканскіх часопісах і кнігах на замежных мовах. Тыя, хто ў свеце заняты ў гэтай сферы, Astronominsk ведаюць.

— ...і звычайная праца...

— ...у адной з мінскіх IT-кампаній. Сачу за якасцю прадукту, шукаю "багі" (памылкі) у камп'ютарных праграмах, выпраўляю іх. У прыватнасці, адзін з нашых замоўцаў — Нацыянальная хакейная ліга (НХЛ), для якой мы распрацоўваем частку праграмнага забеспячэння.

— Крута! Гэта сведчыць аб кваліфікацыі беларускіх IT-спецыялістаў?

— Цалкам дакладна. Мяне, дарэчы, усе лічаць найсціплым чалавекам, і я салідарны з гэтым меркаваннем. І яшчэ я люблю спакой і адзіноту.

Кропка над "і"

— Калі разважаць у межах музыкі, ты назваў бы сябе "збітым лётчыкам"?

— Нешта ў ёй не даспяваў, не дайграў, не рэалізаваў нейкія задумкі? Так, безумоўна, назваў бы. А самае вялікае маё з таго, што не спраўдзілася ў музыцы, — нявыпушчаны альбом, які быў зроблены працэнтаў на восемдзесят.

— А калі выйсці за рамкі музыкі?

— У астатнім я ў чыстым выглядзе дзейны лётчык: палёт працягваецца, толькі самалёт памяняўся. І хуткасць павялічылася!

Хто брэнд, а хто "зорка"

Чым карысны досвед Венецыі?

Частка I. Супрацоўніцтва, супольнасці, калабарацыя

Адзначым адразу, што паняцце "карысці" ў мастацтве мае значэнне больш чым адноснае. Тым не менш, менавіта карысным можа быць знаёмства з канцэпцыямі, з формай падачы праектаў, з практыкай калабарацыі розных краін і грамадскіх арганізацый. Нарэшце, вопыт незалежных удзельнікаў паралельных праграм і проста адначасовая з біенале прысутнасць на венецыянскай арт-сцэне таксама былі б для нас зусім не шкоднымі.
Прыцягну да развагаў свае назіранні не толькі гэтага, але і мінулага года — з нагоды біенале архітэктурнай, якая праходзіць у Венецыі з не меншым размахам. Беларусь у ёй, на жаль, не ўдзельнічае.

Гульня ў карты

Калабарацыяй, як вядома, першапачаткова называлася супрацоўніцтва нейкага брэнда з запрошанай "зоркай", але ў апошнія гады паняцце выкарыстоўваецца значна шырэй. Вось Літва (упершыню), Латвія і Эстонія аб'яднаўшы намаганні ў праекце 2016 года, выбраўшы будынак дзейнага спартыўнага цэнтра ў стылі 1970-х: наўрад ці паасобку яны змаглі б арандаваць такую вялікую прастору. Бетонная блочная пабудова — ужо нечаканасць для Венецыі, асабліва калі яна размешчаная вельмі блізка да Арсенала.

Мабыць, і не скажаш, хто тут брэнд, а хто зорка. Сімвалічны элемент экспазіцыі — дровы, складзеныя як для распальвання печы. Гэта нібы базавая адзнака, той узровень, пачынаючы з якога трэба будзе перапраграмаваць інэртны рэгіён, пераадолець абмежаванні, уласцівыя асобным дзяржавам. Рэтраспектыўную частку ўзмацняе падборка 100 рарытэтных узораў пародзі, знойдзеных у Прыбалтыцы ў 1920-я гады. Тут канцэптуальны пасыл таксама зразумелы: іх знайшлі на глыбіні ажно двух кіламетраў, склалі карту выкапняў, але працы не працягнулі — занадта дорага.

Да грандыёзных візіяў будучыні апелюе праект RailBaltic — самы спрэчны і рэзанансны. Калі ўсё атрымаецца, ён павінен звязаць чыгункай Талін, Рыгу, Каўнас, Варшаву і Берлін (а ў далейшым і Венецыю), інтэгруючы рэйкі Прыбалтыкі ў транспартную сістэму ЕС. На мяжы гратэску — Talsinki, падводны тунэль паміж Талінам і Хельсінкі. У экспазіцыі ўсё гэта абыграна ў вобразах і метафарах, але дакументы, чарцяжы і макеты, вядома, таксама ёсць. А будаўнічыя фірмы, якія падазраюць у карупцыі, прадстаўленыя ў выглядзе ігральных карт з канкрэтнымі назвамі і лагатыпамі. У працэсе гульні вы быццам ствараеце паміж імі пэўныя сувязі, удзельнічаеце ў сумнеўных бізнес-камбінацыях.

Увесь гэты шэраг асобных праектаў мастакоў і архітэктараў аб'яднаны вельмі арганічна і служыць агульнай мэце — прадставіць архітэктурнае асяроддзе Балтыйскіх краін як адзіную прастору ідэй. А ў цэлым экспазіцыі ўласцівы "сацыяльны паварот", легітымізаваны брытанскім арт-крытыкам Клер Бішоп, якая адзначае, што гэта адна з самых значных і ўстойлівых тэндэнцый у сучасным мастацтве апошніх дзесяцігоддзяў. Асноўная тэза Бішоп — перакананне, што "аўтэнтычнасць укаранілася ў сацыяльным" — падобна, блізкая і многім маладым беларускім мастакам.

Акрамя дрэва, аўтары працуюць з самымі рознымі матэрыяламі практычна ў іх натуральным выглядзе, але з выкарыстаннем актуальнага экспазіцыйнага дызайну найвышэйшага гатунку. Чаго толькі няма ў гэтым арсенале: водараці, пясок, камяні, зямля, торф, гліна, разнастайныя лісце, трава, карані, галінкі, і вядома, вада ва ўсіх станах. Пры гэтым, аўтары сцвярджаюць: матэрыял не прынцыповы, галоўнае — мець, што сказаць.

Не адмоўлю сабе ў задавальненні прыгадаць простую і дасціпную канцэпцыю праекта, які з'яўляецца працягам Балтыйскага павільёну. Ён прысвечаны грандыёзнай Латвійскай Нацыянальнай бібліятэцы, чыё з'яўленне выклікала шмат крытыкі. Куратары папрасілі бібліятэкараў з усёй краіны даслаць фатаграфіі сваіх мясцовых бібліятэк. Аднапавярховыя, вясковыя, у адно-два акенцы, рознага часу пабудовы... Тут мы таксама маем справу з пэўнай куратарскай практыкай, дзе мастацтва разумеецца як "месца, якое стварае спецыфічную прастору зносін", не разбурае, а спараджае адносіны (Нікаля Бурыо).

Жывыя дрэвы і мёртвы метал

Яшчэ больш прадстаўнічым атрымаўся аб'яднаны Скандынаўскі павільён, у рамках якога Фінляндыя, Нарвегія і Швецыя паказалі на арт-біенале праект Mirrored ("Люстраны"), а на архітэктурным — In therapy: nordic countries face to face ("У тэрапіі: паўночныя краіны тварам да твару"). "Люстраныя" — гэта некалькі велізарных мудрагелістых выгнутых металічных лопасцяў. Паміж імі — жывыя дрэвы. Дзіўныя, здавалася б, неспалучальныя рэчы. Але, у той самы час, злучэнне маштабных натуральных і штучных аб'ектаў у адзінай прасторы можна інтэрпрэтаваць як развіццё "Матэрыі часу" (1994 — 2005) Рычарда Серра — праекта, які ўяўляе з сябе восем сфер са сталі ў Музеі Гугенхайма ў Більбао.

Найбуйнейшы мастак сучаснасці, а ўслед за ім і скандынаўскія калегі, разважаюць пра прыроду скульптуры, фізічныя якасці прасторы, уздзеянне на ўспрыняцце чалавека. Але ў дадзеным выпадку хачу асабліва падкрэсліць не галавакружнае адчуванне прасторы ў руху, а супрацоўніцтва краін, якія, без сумневу, маглі дазволіць сабе і асобныя нацыянальныя павільёны.

Павільён у выглядзе кнігі

Вядома, на Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва няма канкрэтных адказаў або ўзораў, як трэба рабіць і чаго рабіць дакладна не трэба. Але рэмінісцэнцый, адсылак і намёкаў — маса.

Куратарка Крысцін Масэль сабрала сваё выказванне як адзінае цэлае ў "кнізе" з 9 частак: "Час і бясконцасць", "Радасці і страхі", "Павільён шаманаў", "Дыянісійскі павільён", "Ідэнтычнасць" і гэтак далей. Такім чынам, асноўны праект біенале ў памяшканні Арсенала выглядаў шэрагам залаў, якія Крысцін назвала раздзеламі кнігі. Яны даволі абстрактныя, але ёсць адзін — "Мастакі і кніга" — цалкам матэрыяльны. Гэта нешта накшталт бібліятэкі з рэальнымі выданнямі і чытачамі. Паводле задумы, там прадстаўлены любімыя кнігі мастакоў-удзельнікаў біенале, а канцэптуальна можна падвярстаць выдатны блок тэорый.

Напрыклад, ідэю Рычарда Рорці пра тое, што чалавек ёсць толькі сумай слоўнікаў, якімі ён можа апісаць свет. А пошукі слоўніка з наступнымі спробамі выхаду з яго — гэта шлях да метафары, які ўжо мае непасрэднае дачыненне да мастацтва. Рорці лічыў, што чым больш слоўнікаў у валоданні людзей, тым больш у іх шанцаў на салідарнасць. У гэтым ёсць пэўны прагматызм, але выводзіць ён з гэтага тэорыю пераходу "Ад рэлігіі праз філасофію да літаратуры: шлях заходніх інтэлектуалаў", даводзячы, што менавіта літаратурная культура (неўзабаве пасля Канта) завяршае гэтую трыяду інтэлектуальнага развіцця.

На біенале ёсць і іншыя прыклады аб'яднанняў — грамадскіх арганізацый, гандлёвых марак класа luxury або Еўрапейскі культурны цэнтр з "Персанальнымі структурамі", пра які я ўжо пісала. Ёсць павільён дыяспар, ёсць перфарматыўныя практыкі, якія аб'ядноўваюць аўтараў-мігрантаў, ёсць... ці мала яшчэ што ёсць!

Любоў ГАЎРЫЛЮК,
арт-журналіст
Фота аўтара

Арт-аб'ект Аляксандра Бродскага.

У павільёне Макао.

Фрагмент экспазіцыі галоўнага куратарскага праекта Алехандра Аравены.

Пераможныя "Сустрэчы з гісторыяй"

Дакументальная стужка "Бітва за Кобрын. Закладнікі сакрэтнага пакта" майстэрні Уладзіміра Бокуна заняла другое месца на кінафестывалі "Сустрэчы з гісторыяй" у Замосці на поўдні Польшчы, што завяршыўся на мінулым тыдні.

Сярод мноства польскіх кінафорумаў гэты займае асобнае месца, бо збірае толькі фільмы на гістарычную тэму. Сёлета ў праграму трапілі 15 стужак. Адна з якіх беларуская — "Бітва за Кобрын. Закладнікі сакрэтнага пакта", што здымалі летась для праекта тэлеканала АНТ "Зваротны адлік".

За яе аснову ўзятая гісторыя капрала Войска Польскага Эварыста Зайкоўскага, які ў 28-гадовым узросце пакінуў дома жонку і маленькую дачку, каб у верасні 1939 года пайсці ваяваць у складзе 83-га палка палескіх стралкоў разам з ураджэнцамі Заходняй Беларусі.

Гэта інфармацыя была знойдзеная ў архівах пасля таго, як у 2008 годзе падчас пошукавых работ пад Кобрынам знайшлі безыменную брацкую магілу часоў Другой сусветнай вайны. Выявілася, што 13 з салдат, рэшткі якіх адшукалі, належаць не да савецкага ці нямецкага, а да Войска Польскага. Пошукі адказаў, як яны апынуліся пад Кобрынам, і прывялі да гісторыі капрала Зайкоўскага.

— Праца над фільмам патрабавала сур'ёзнага даследавання архіўных даных, — распавялі рэжысёры Уладзімір Луцкі і Ірына Васільева. — Акрамя таго, нам удалося сустрэцца ў Польшчы з дачкой Зайкоўскага Ханнай Цыганчук-Пракопчык, якая падзялілася надзвычайнай гісторыяй пра тое, як усё жыццё шукала магілу свайго бацькі.

Здымкі сцэны, як Эварыст Зайкоўскі збіраецца на фронт.

— Збор матэрыялаў пачаўся яшчэ ў 2011 годзе, — распавёў сцэнарыст Ігар Мельнікаў. — Я працаваў у архівах Беларусі і Польшчы, шукаў успаміны відавочцаў абароны Кобрына 1939 года, арыгінальныя артэфакты і фотаздымкі. Нам дапамагалі археолагі, краязнаўцы, сям'я Зайкоўскага, старажылы Кобрына.

— Другое месца — высокая ўзнагарода фестывалю ў Замосці і прызнанне таго, што ўзровень фільмаў нашай студыі не саступае польскай дакументалістыцы, хаця яна лічыцца адной з наймацнейшых у Еўропе, — адзначыў прадюсар стужкі Уладзімір Бокун.

К

Безумоўна, вынесенае ў падзагаловак сцверджанне носіць правакацыйны характар. Аднак яно не такое абсурднае, як гэта можа здацца. У 2011 годзе на тэлеэкраны выйшаў расійскі серыял Уладзіміра Бартко "Пётр Першы. Запавет". Хутчэй за ўсё, самай запамінальнай сюжэтнай лініяй гэтага серыяла з'яўляецца інтымная сувязь Пятра I і маладой княгіні Марыі Канцямір, якую сыграла Лізавета Баярская. Тата Міхаіл стаў і яе кіношным бацькам, гаспадаром Малдавіі князем Дзмітрыем Канстанцінавічам Канцямірам. Натуральна, ёсць у фільме і кадры з малодшым сынам князя — маладым Антыёхам. А ён, ні многа ні мала, — першы грамадзянскі паэт Расіі!

Здавалася б, што можа быць агульнага паміж гэтай гісторыяй і галоўнай тэмай нашага серыяла "Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча"? Паміж першапраходцамі ў рускай паэзіі — і ў беларускай. У чытачоў "К" ёсць магчымасць даведацца пра гэта першымі.

Гаспадар Малдавіі канца XVII — пачатку XVIII стагоддзяў Дзмітрый Канцямір.

Рэвельскі Монтэ-Крыста

Брат аўтара "Пінскай шляхты" — спадчыннік Малдаўскага прастола

Міжканфесійны шлюб

У лютым 1804 года да сябра Свяцейшага Сінода мітрапаліта Амброзія звярнуўся з прашэннем лейтэнант балтыйскага вяслярнага флоту Ігнат Іванавіч Марцінкевіч, каталіцкага веравызнання. У Расіі гэтае прозвішча часцей пісалі праз літару "т", а не "ц", што часам нават прымала форму "Мартынкевич" — менавіта такі варыянт чытаецца і ў асабістым подпісе Ігната. Адзінакроўны брат нашага класіка Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча прасіў аб наступным: "Маю я намер злучыцца законным першым шлюбам з адстаўнога палкоўніка князя Дзмітрыя Канцяміра дачкой, дзяўчынаю Сафіяй, якая вызнае грэка-расійскую веру, без перамены закона майго". Цікава, што ні адно з вядомых мне генеалагічных даследаванняў княжаскага роду Канцяміраў нават не згадвае пра існаванне ў Дзмітрыя дачкі, часцей за ўсё наогул абвяшчаючы яго ці нежанатым, ці бяздзетным.

27 лютага адбылося пасяджанне Санкт-Пецярбургскай духоўнай кансісторыі, якое пастанавіла: *"Ад роду яму 32-гі год, нарадзіўся ў горадзе Вільні, бацька ягоны Іван Марцінкевіч ротмістр, а маці Людавіка Рыкачэўская, якая ўжо памерла, а бацька знаходзіцца ў жывых і знаходзіцца ў каталіцкім законе, у якім і ён народжаны і выхаваны, жанаты не быў, і калі дазволена будзе яму спалучыцца законным першым шлюбам з дзяўчынаю Сафіяй... то ён... абавязваецца па злучэнні шлюбам ва ўсё сваё жыццё гэную сваю жонку ні спакусамі, ні ласкай, ні іншымі відамі ў свой каталіцкі закон не схіляць і за ўтрыманне праваслаўнай веры ніякай ёй знявагі і дакоры не чыніць. Калі ад іх, Ігната і Сафіі, будуць нараджацца дзеці, то гэтых хрысціць у праваслаўную веру, і ад маленства гадуючы, навучаць кожнага праваслаўнай царквы ўсходняй звычаю, а ў свой каталіцкі закон не пераводзіць, і па сямі гадах ад нараджэння для споведзі і святога прычасця прадстаўляць расійскай царквы святарам. І ўсё гэта паказаў ён як самую шчырую праўду пад страхам паказанага законам штрафу"*.

28 лютага 1804 года маладыя вянчаліся ў царкве ў імя Святой Жыццепачатнай Троіцы ў Галернай гавані, якая знаходзілася на Васільеўскім востраве ў Санкт-Пецярбургу. Можам выказаць здагадку, што на гэтай знакавай падзеі прысутнічалі ўсе сваякі Марцінкевіча, якія жылі тады ў расійскай сталіцы, уключаючы мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча, сястры якога Ганне Ігнат даводзіўся ўнукам. Хутчэй за ўсё, улічваючы важнасць падзеі (усё-такі, вяселле старэйшага сына!), на вяселлі гуляў і сам Ян Марцінкевіч. Але ў дадзеным выпадку нас больш цікавяць новыя сваякі гэтай сям'і па лініі нявесты.

Нашчадак Едыгея

Гісторыя роду Канцяміраў вымагае хаця б кароткага экскурсу. Ужо згаданы намі таварыш Пятра I Дзмітрый нарадзіўся ў XVII стагоддзі ў сям'і гаспадара (так называлася вышэйшая пасада) Малдаўскага княства Канстанціна. У тыя часы Малдова знаходзілася ў залежнасці ад Асманскай імперыі, і першая асоба княства выбіралася ў Стамбуле. Натуральна, па прынцыпе найбольшай адданасці. А інтрыгі ў сталіцы велізарнай дзяржавы часта прыводзілі да таго, што кіраўнікі проста з трону адпраўляліся ці ў турму, ці нават на плаху. Прыкладам, Дзмітрый, абраны гаспадаром пасля смерці бацькі, з першай спробы пратрымаўся на троне ўсяго тры тыдні, а затым апынуўся ў вязніцы разам з братам Антыёхам. Праўда, дзякуючы сваім сувязям і багатым падарункам, яны хутка адтуль выйшлі. У будучыні кожнаму было наканавана займаць гэты прастол ажно па два разы.

Разумеючы хісткасць свайго становішча на малдаўскім троне, Канцяміры сталі шукаць новых моцных саюзнікаў і ўбачылі лепшым варыянтам праваслаўную Расійскую імперыю. Доўгая падпольная разведвальная праца братоў скончылася тым, што паміж Пятром I і Канцямірамі 3 красавіка 1711 года быў заключаны сакрэтны Луцкі дагавор. Дакумент прадугледжваў вызваленне Малдавіі ад асманскага валадарства і яе пераход пад пратэктарат Расіі. Княству акрамя тэрытарыяльных набыткаў былі абяцаны самастойнасць ва ўнутраных справах і, што асабліва важна для гэтага артыкула, вечнае замацаванне малдаўскага трона за кіруючай дынастыяй Канцяміраў.

Аднак Пруцкі паход Пятра I скончыўся паразай. Расія не толькі не здабыла Малдавію, але і страціла нядаўна заваяваныя Азоў і бераг Каспійскага мора. Дзмітрый Канцямір і каля 1000 яго баяраў вымушаныя былі эміграваць у Расію. Там гаспадар быў узведзены ў княжую годнасць, надзелены маёнткамі пад Масквой і ў Харкаўскай губерні і прызначаны сенатарам. Рэшту жыцця ён правёў, робячы ўсё магчымае для ажыццяўлення сваёй мары па вяртанні на трон Малдавіі. У прыватнасці, Дзмітрый праводзіў вялікую ідэалагічную работу, прапавядуючы ідэю вызвалення хрысціянскіх народаў ад прыгнёту мусульман. Ён шмат пісаў пра гісторыю сваёй радзімы і Асманскай імперыі (яго лічаць першым расійскім усходазнаўцам), а таксама і ўласнага роду. Аднак сёе-тое яму давялося ўтаіць альбо нават сфабрыкаваць. Прынамсі, так лічаць сучасныя даследчыкі.

Князь Дзмітрый у сваіх працах сцвярджаў, што яго продкам быў ніхто іншы, як сам хан Цімур, ён жа Тамерлан — адзін з найвялікшых заваёўнікаў за ўсю гісторыю чалавецтва. І сапраўды, у самім прозвішчы Канцямір лёгка чуецца "хан Цімур". Аднак у сваёй кнізе "Эпоха і новая трактоўка радаводу Канцяміраў: канец XIV — першая палова XVII стст." малдаўскі навуковец і дыпламат Фёдар Ангелі, вывучыўшы турэцкія архівы, прыйшоў да высновы, што карані Канцяміраў вядуць не да Тамерлана, а да эміра Едыгея з племя Мансураў Вялікай Нагайскай арды. Ён кіраваў Залатой Ардой больш за 20 гадоў. У сваю чаргу, карані Едыгея ўзыходзяць да Нагая, праўнука хана Джучы, старэйшага сына Чынгізхана. "Канцямір" з нагайскай мовы перакладаецца як "Жалезны хан". Насуперак сцверджанням некаторых гісторыкаў, ніякіх славянскіх ці грэчаскіх каранёў у Канцяміраў не было.

Дзед Дзмітрыя Канцямір Арасланоглу або Канцямір-мурза — намеснік асманскай правінцыі Сілістра, заснавальнік і першы кіраўнік Буджацкай (Акерманскай альбо Белгарадскай) арды, вядомая ў гісторыі асоба. У 1637 годзе ён скончыў сваё бурлівае жыццё на шыбеніцы, апынуўшыся там па загадзе султана Мурада IV. Менавіта гэты факт мог паслужыць штуршком да пераходу яго сына ў праваслаўе.

Бацька Сафіі быў унучатым пляменнікам персанажа Міхаіла Баярскага. Адстаўны палкоўнік, які таксама меў імя Дзмітрый, і сам мог бы стаць персанажам рамана або фільма. Баявы афіцэр, герой некалькіх руска-турэцкіх войнаў — і шматгадовы вязень Рэвельскай крэпасці (Рэвель — цяпер горад Талін). Прынамсі, пра 17 гадоў яго няволі сцвярджаецца ва ўсіх артыкулах пра Канцяміраў.

Апошняя агаворка невыпадковая: яго жыццё поўнае загадак і блытаніны. Прывяду толькі асноўныя спрэчныя моманты:

1. Дзмітрый — сын а) Канстанціна Дзмітрыевіча і б) Канстанціна Антыёхавіча Канцяміра.

2. Дзмітрый — а) апошні з роду Канцяміраў, не жанаты, б) быў жанаты, але бяздзетны і в) быў жанаты, і ў яго быў сын Антыёх.

3. Дзмітрый быў а) вар'ятам і б) ён быў абвешчаны вар'ятам за прэтэнзіі на малдаўскі трон.

4. Дзмітрый а) правёў у крэпасці 17 гадоў і выйшаў на свабоду і б) памёр у турме.

На некаторыя пытанні я ўжо магу даць адказ, а некаторыя патрабуюць дадатковага вывучэння.

Нарадзіўся Дзмітрый Канцямір у 1747 годзе ў сям'і князя Канстанціна Антыёхавіча і яго трэцяй жонкі Сафіі Багданаўны Пасек. Канстанцін у 1738 годзе прыбыў у Расію і стаў на чале малдаўскага корпуса — дабравольніцкага падраздзялення, якое мела свае сцягі і форму ды налічвала каля 1000 байцоў. Корпус прыняў актыўны ўдзел у руска-турэцкай вайне 1735 — 1739 гадоў. 1 верасня 1739 году князь Канстанцін уступіў у Ясы, дзе яго сустракалі як гаспадара — з ключамі ад краіны. Ужо 12 верасня ў рускім лагеры святкавалі вызваленне Малдавіі ад валадарства Асманскай імперыі, аднак з-за міжнароднай абстаноўкі канчатковы захоп гэтай краіны тады адсунуўся ў будучыню.

Ваенныя подзвігі Канстанціна былі ацэненыя па заслугах — ён даслужыўся да чыну генерала-паручніка і парадніўся з самымі зорнымі фаміліямі імперыі. У Кіеве Канстанцін Антыёхавіч каля 1741 года ўступіў у другі шлюб — з Наталляй Іванаўнай Галавіной, дачкой адмірала і паплечніка Пятра I Івана Міхайлавіча Галавіна. Аднак, хутчэй за ўсё, яна неўзабаве памерла, і Канцямір ажаніўся ў трэці раз. Нявесту выбраў не менш зайздросную — сястру генерал-аншэфа Пятра Багданавіча Пасека Соф'ю. Яе пляменніцы былі замужам за аднымі з самых уплывовых людзей свайго часу: Ганна — за Захарам Чарнышовым, а Марыя — за Пятром Паніным. Аднак да галоўнай сваёй мары — вяртання на трон Малдавіі — Канстанцін так і не дажыў: ён памёр у 1776 годзе і пахаваны ў сямейным некропалі роду Канцямір пад Харкавам у вёсцы Рогань, дзе знаходзілася частка іх багатых уладанняў.

У сям'і Канцяміраў памяталі ўмовы дагавора з Пятром I і верылі, што як толькі Малдавія будзе вызвалена і стане дзяржавай пад пратэктаратам Расіі, хто-небудзь з роду Канцяміраў будзе кіраўніком гэтай краіны. Так, у 1736 годзе, калі падчас чарговай руска-турэцкай вайны быў зноў заваяваны Азоў, Марыя Канцямір пісала брату Антыёху, які ўжо на той час быў вядомым рускім паэтам: "...Калі Вам наканавана будзе зрабіцца гаспадаром нашай радзімы, Вы павінны будзеце развітацца з адасобленым жыццём філосафа". Зрэшты, перасцярогі былі марнымі.

Нядзіўна, што многія Канцяміры выбіралі сабе ваенную кар'еру і праявілі свой гераізм менавіта ў руска-турэцкіх войнах. Падобна на тое, што менавіта гэтая вера слову Пятра I і сыграла злы жарт з Дзмітрыем Канстанцінавічам Канцямірам. Пагатоў, былі абставіны, якія маглі сур'ёзна закружыць яго галаву: усе іншыя нашчадкі двух прызнаных Расіяй гаспадароў Малдавіі князёў Антыёха і Дзмітрыя памерлі яшчэ да стаўлення будучага цесця Ігната Марцінкевіча.

Такім чынам, у 1780 годзе адзіным прэтэндэнтам на трон Малдавіі стаў палкоўнік князь Дзмітрый Канстанцінавіч Канцямір, якому на той момант быў 31 год. Падобна на тое, што як толькі перспектывы заваёвы Малдавіі сталі рэальнымі, ён заявіў пра свае прэтэнзіі на трон. Аднак у Кацярыны II былі на гэты конт зусім іншыя планы.

Зміцер ДРОЗД,
гісторык, архівіст



Прашэнне Ігната Марцінкевіча да мітрапаліта Амброзія. 1804 год.

Герб роду князя Канцяміра.

Працяг — у наступных нумарах "К".

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:

■ Выстава **"Айвазоўскі і марыністы"** — да 31 жніўня.
■ Выстава жывапісу Паўла Масленікава — да 27 жніўня ў Палацы Незалежнасці.
■ Выстава **"Марк Шагал: Колер Любові"** — да 15 верасня.
■ Выстава **"Майстры польскага малюнка"** — да 20 верасня (спецыяльна для наведвальнікаў на выставе працуюць дзве інтэрактыўныя зоны, а таксама інтэрактыўная праграма "Кропка, лінія і штрых і вобраз, які жыве ў іх!").
■ Выстава **"Міхаіл Блішч. Да 100-годдзя з дня нараджэння"** (прадстаўлена звыш за 50 твораў жывапісу, сцэнаграфіі, графікі) — да 24 верасня.
■ Выстава **"Горад. Архітэктура. Мы"**, прымеркаваная да святкавання 950-годдзя Мінска, — да 1 кастрычніка.
■ Выстава **"Магія старых фатаграфій"** (Мінск 1930 — 1960-х у фотаздымках мастакоў Анатоля Тычыны і Мікалая Міхалапа).
■ Фотавыстава **"Спорт — толькі частка майго жыцця"** — да 5 верасня.
■ Новая забаўляльна-пазнавальная экскурсія для дзяцей 8 — 14 гадоў **"Самыя-самыя..."**.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстава альтэрнатыўнай фатаграфіі Віктара Жураўкова **"Manuum hominum"** — да 1 кастрычніка.
■ Выстава моды і аксэсуараў эпохі Рамантызму з калекцыі Ігара Сурмачэўскага **"І паланэз пачаць пара"** — да 13 студзеня 2018-га.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Узбекістана **"Казачны Самарканд"** — да 17 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і гераldыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць сем музеяў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Летняя адукацыйная праграма **"Летняя гісторыя"** (у цыкл уключаны 6 музейна–педагагічных праграм — 2 экскурсіі, 3 музейна–педагагічныя заняткі, квэст).
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.

Выставы:

■ Выстава **"Скарына — асветнік–гуманіст"** — да пачатку кастрычніка.
■ Выстава **"IND–БЕЛ–ART"** (творы Рыгора Сітніцы, Юрыя Хілько, Дар'і Бунеевай і Веры Ягоўдзік, выкананыя па ўражаннях іх паездкі ў Індыю) — да 3 верасня.
■ Прэзентацыя унікальнага аўтарскага праекта Ахрэма Белабровіка **"VKL3D"** — 29 жніўня. Пачатак а 14-й.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўненыя новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
■ Святломузычная выстава **"Атлантыда"** — да 31 жніўня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.
■ Выстава **"Візіты і візіткі: дыпламатыя ў кішэні"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ "Выстава насякомаедных раслін".
■ Выстава **"Жывыя цмокі"** — да 25 лютага 2018-га.

г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Сафары парк"** — да 1 верасня.
■ Выстава **"Дзівосны свет матылькоў"** — да 11 верасня.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава **"Карціны і высокая мода"** — да 10 верасня.
■ Выстава аўтарскай лялькі Валерыі Гайшун **"Натура, якая сыходзіць"** — да 23 верасня.
■ Выстава рэтра–электрагітар **"Зроблена ў СССР"** — да 1 верасня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Мінску 950..."** (прадстаўлены тэматычна разнастайны матэрыял XIX — XXI стагоддзяў з прыватных калекцый, а таксама прадметы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея) — да 17 верасня.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Беларускі кінематограф 1920 — 1930-х гг. у кінаплакаце"** — да 17 верасня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+ 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Міжнародны выставачны праект **"Заходняя Беларусь: гісторыя паўсядзённасці"** — да 30 верасня.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Анімацыйная праграма **"Немагчымае магчыма: на аўдыенцыі ў войта!"** *Другі паверх Слуцкай брамы*
■ Часовая экспазіцыя **"З малітвай на вуснах"** — да 30 верасня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Міжнародная выстава **"Ultima ratio Regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII — пачатку XVIII стст."** — да 24 верасня.
■ Выстава **"Ігнат Дамейка — тытан навукі"** — да 30 верасня.
■ Квэст **"Вайна і Мір, альбо Таямніца дзвюх скрынь"** — кожную пятніцу. Пачатак а 15-й.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"** — да 30 верасня.
■ Выстава партрэтаў Якуба Коласа з фондаў музея **"Спяшайцеся з паэтам стрэцца..."** — да 2 верасня.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.

Музейны адукацыйны праект "Летняя канікулы ў Доме Коласа":

■ Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**
■ **"Песняй вітаю я вас!.."** — традыцыйнае свята музея да Дня ведаў — 1 верасня (музейныя майстар-класы па вырабе паштовак і лялечныя прадстаўленні — пачатак аб 11-й; аглядныя экскурсіі па ўсіх залах музея з элементамі "ажыўшай экспазіцыі" — з 11.00 да 17.00.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.
■ Фотавыстава Войтэха Рушына (Славакія) **"Паэзія чалавечай душы"** — да 26 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава твораў Ілоны Касабука **"Прызнанне гораду"** — да 1 кастрычніка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Ганаровану грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ Выставачна-інтэрактыўны праект **"Сустрэча з майстрам".**
■ Персанальная выстава Святланы Катковай **"Спатканне"** — да 3 верасня.
■ Выстава **"Yiwarra Kuju: Жывёлаперагонны маршрут Кэнінга. Мастацтва абарыгенаў Заходняй Аўстраліі"** — да 27 жніўня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава жывапісу Эміліі Фокіной **"Дзіўныя звяры"** — да 27 жніўня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Нить связующая"** — да 27 жніўня.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.

■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.

■ Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

■ Выстава жывапісу, графікі, габелена і керамікі вядомых беларускіх мастачак **"Summer time"** — да 3 верасня.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Гомель і гамяльчане напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны"** (выставачная зала).
■ Выстава **"Бітва матораў"** (хол музея).

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера".**
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна...".**
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі".**
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны".**
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт".**
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР
г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2 68 96.

■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Беларускія яўрэі", "Другая сусветная вайна"**.
■ Выстава карцін Івана Струкава **"Саюз вады і зямлі"**.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра **"Батлейка"**.

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл. (8-01597) 2 14 70.

■ Пастаянная экспазіцыя:
"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны".
г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.

■ Экспазіцыя:
"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне".

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).

■ Пастаянная экспазіцыя:
"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча".
■ Пастаянныя выставы:
"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы".

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава арыгамі Дзмітрыя Лысюка **"Шлях да саторы"** — да 31 жніўня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

■ Выстава твораў Сяргея Пыжыкава **"У пошуках Рая"** — да 9 верасня.
■ Выстава Віктара Доўнара **"Таямнічы свет беларускіх абразоў"** — да 9 верасня.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

МАГАЗІНЫ "БЕЛСАЮЗДРУК"
■ Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".
■ Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".
■ Праспект Незалежнасці, д. 44.
■ Вуліца Валадарскага, д.16.

КІЁСКІ "БЕЛСАЮЗДРУК"
■ ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.
■ Праспект Пераможцаў, 5.
■ Вуліца Рабкораўская, д.17.
■ Праспект Незалежнасці,168, В.
■ Вуліца Лабанка, 2.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА Б БЫЦЬ ВАША АФІША!
Звяртайцеся
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс)
kultura@tut.by